www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 9 кастрычніка 2006 года, №№ 15-16 (1945-1946)

АКТУАЛЬНА

## ПА НОВЫМ СТАТУЦЕ

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 25 верасня падпісаў указ аб статуце Беларускага дзяржаўнага універсітэта.***

Па словах начальніка ўпраўлення прававой работы Алены Швакавай, новы дакумент, па якім адгэтуль будзе жыць БДУ, стаў карацейшым, ён цалкам адпавядае патрабам дзейнага заканадаўства і задавальняе патрэбы калектыву універсітэта, вылучаецца яснасцю, дакладнасцю і празрыстасцю. У новай рэдакцыі статуту даецца больш акрэсленае вызначэнне паняцця "комплекс БДУ". Упарадкаваная структура кіравання універсітэтам: органаў кіравання стала менш, што дазволіць аператыўна і якасна вырашаць адміністрацыйныя, арганізацыйныя і гаспадарчыя пытанні. Рэктар прызначаецца ўказам кіраўніка дзяржавы.

Асабліва важна тое, што цяпер не ў тэксце статуту, а ў самім указе замацоўваецца права самастойна выкарыстоўваць маёмасць, перададзеную БДУ, а таксама адзначаецца, што "вылучаныя Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту зямельныя ўчасткі знаходзяцца ў бестэрміновым і бязвыплатным карыстанні. Беларускі дзяржаўны універсітэт мае права даваць іх у часовае карыстанне, у тым ліку па дагаворах арэнды".

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## З РАСІІ З МЕДАЛЯМІ

***5 залатых і 3 срэбраныя медалі, а таксама 3 заахвочвальныя дыпломы атрымала інавацыйная прадукцыя БДУ на IX Міжнароднай выставе-кангрэсе "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі". Яна прайшла з 25 па 28 верасня ў Санкт-Пецярбургу.***

Такім чынам, узнагародамі былі адзначаныя ўсе 11 навукова-тэхнічных распрацовак БДУ, прадстаўленых на гэтым форуме.

Дыпломамі І ступені з уручэннем залатых медалёў узнагароджаныя камплекты раствораў для аэразольна-струмянёвай металізацыі пры атрыманні галаграфічных знакаў; парашкі і праяўляльнікі для дактыласкапічнай экспертызы; дзве ўзбагачальныя фітакампазіцыі "Брыз" і "Дэметра" для хлебабулачных вырабаў, а таксама хлебабулачныя вырабы з фітакампазіцыяй "Аўрора-7", узбагачаныя біядаступным селенам.

На экспазіцыі БДУ дэманстраваліся перадавыя тэхналогіі машынабудавання, інфармацыйныя тэхналогіі і электроніка, вытворчыя тэхналогіі, новыя матэрыялы і хімічныя прадукты.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2005-2006 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ НА 2006-2007 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД Стар. 2-3

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ Стар. 4

ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ — 85 Стар. 5

ХІМІЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ — 75 Стар. 6

ПАДЗЕІ

## ЖЫВОЕ СЭРЦА "БРЫГАНЦІНЫ"

***Лета круглы год цяпер не толькі ў песеньцы "Чунга-Чанга", але і ў спартыўна-аздараўленчым комплексе БДУ "Брыганціна". Універсітэту 85 гадоў споўніцца толькі 30 кастрычніка, а ўрачыстасці і падарункі ўжо ледзь паспяваюць змяніць адно аднаго. Толькі-толькі адчыніўся спарткомплекс, як ужо адбыўся ўрачысты пуск цеплавога цэнтра ў САК "Брыганціна". Цяпер тут змогуць у любую пару года адпачываць і ўдзельнічаць у разнастайных школах і семінарах выкладчыкі і студэнты ўсіх навучальных установ краіны.***



Працуе цеплацэнтр ад драўнянага пілавіння (і гэта не шчэпы, а літаральна сцёртая ў парашок драўніна), прычым у 7—10 разоў больш эканомна, чым традыцыйныя ацяпляльныя сістэмы: раней "Брыганціна" карысталася цеплавой энергіяй ад старой кацельні, што стаіць за паўтара кіламетра ад комплексу і працуе на мазуце. 1 кубаметр пілавіння (вагой 300 кг) каштуе 1000 беларускіх рублёў. На суткі патрэбна прыблізна 30 кубаметраў. Абсталяванне цеплацэнтра створана ў Беларусі па французскай тэхналогіі.

Пабудавана цепластанцыя па ініцыятыве БДУ разам з Камітэтам па энергазберажэнні. Кошт праекту — 1600 мільёнаў рублёў, акупіцца ён гадоў праз пяць.

У сваёй прамове рэктар БДУ, прафесар Васіль Стражаў прывёў такую алегорыю: ранейшае існаванне "Брыганціны" можна параўнаць са штучным сэрцам, якое можа працаваць, а можа і выключацца. Ад сённяшняга дня гэта сапраўднае жывое сэрца, якое забяспечыць работу "Брыганціны" на многія дзесяцігоддзі. Гэта прыклад прымянення найноўшых супертэхналогій, працы на мясцовай сыравіне і самастойнага забеспячэння ўласнай жыццядзейнасці, а таксама вынік шчыльнага супрацоўніцтва з Камітэтам па энергазберажэнні і непасрэдна яго старшынёй Львом Дубовікам.



Асвячаў будынак айцец Серафім, першы прарэктар інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы. Чырвоную стужку перарazалі ўдвух: рэктар БДУ Васіль Стражаў і дырэктар "Брыганціны" Уладзімір Палякоў. Следам за імі прайшлі ў будынак і госці. Унутры Васіль Іванавіч урачыста запаліў кацёл, паднёсшы паходню да топкі.

Разам з кіраўніцтвам мы ад пачатку да канца прасачылі за працэсам нарыхтоўкі цяпла. Сістэма тут цалкам аўтаматызаваная (яе абслугоўвае толькі адзін аператар). Побач з будынкам размяшчаецца бункер з запасам пілавіння на тыдзень — 200 кубаметраў. Паводле слоў Уладзіміра Палякова, на год спатрэбіцца 10 тысяч кубаметраў пілавіння, а значыць — 10 мільёнаў рублёў. Раней за адзін толькі месяц даводзілася траціць 30 мільёнаў рублёў на ацяпленне — эканомія відавочная. Аднак вернемся да працэсу вытворчасці цяпла. Пілавінне аўтаматычна паступае на канвеер. Пілавінне насыпана горкай, верхавіна якой перакрывае фотаэлементы, па меры расходу пілавіння горка ссыпаецца і фотаэлементы перасякаюцца, тады яны перадаюць адпаведны сігнал, каб паступала новая порцыя паліва. Пры нас цеплацэнтр працаваў у эканомным рэжыме (толькі адзін кацёл і не на поўную моц), а ў моцныя маразы можна ўключыць два катлы.

Для работы катла выкарыстоўваецца толькі ачышчаная і пазбаўленая жалеза вада (ёсць спецыяльная сістэма ачысткі), бо без гэтага абсталяванне хутка стане непрыдатным.

Каардынацыйны цэнтр цеплавой станцыі — камп'ютар з сэнсарным экранчыкам, на якім адлюстроўваюцца ўсе параметры работы катла (тэмпература вады, тэмпература ў топцы ды інш.) і сістэма дапамогі ў выпадку аварыі — 17 кнопак у адпаведнасці з відам няспраўнасці. Націснуўшы на тую, што заміргала, а гэта сведчыць пра паломку, можна азнаёміцца з інструкцыяй па ліквідацыі канкрэтнай няспраўнасці.

Няхай жывое сэрца "Брыганціны" дасць новае жыццё ўсяму універсітэту!

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Пачаўся візіт дэлегацыі кіраўнікоў ВНУ нашай краіны на чале з рэктарам БДУ, прафесарам Васілём Стражавым у КНР. У праграме — наведванне правінцыі Хэйлунцзян і горада Харбін. В. Стражаў выступіць з дакладам на VI Міжнародным форуме рэктараў універсітэтаў паўночна-ўсходняга Кітая, Далёкага Усходу і Сібіры Расіі, які пройдзе 11—12 кастрычніка ў Харбіне. Тэма сходу "Якасць вышэйшай адукацыі і міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі". Удзел у ім прымуць кіраўнікі вышэйшага ўзроўню міністэрстваў адукацыі КНР і РФ, а таксама 120 рэктараў ВНУ гэтых краін. У рамках візіту ў правінцыю Хэйлунцзян В. Стражаў правядзе шэраг дзелавых сустрэч з кіраўніцтвам Харбінскага універсітэта нафтахіміі, а таксама прадстаўнікамі аднаго з харбінскіх навукова-вытворчых прадпрыемстваў.

У рамках адзінага рэспубліканскага дня інфармавання рэктар БДУ, прафесар В. Стражаў прачытаў лекцыю для навучэнцаў сталічнай гімназіі № 23. Дарэчы, тут эксперыментальна ўведзена вывучэнне кітайскай мовы, якую выкладаюць выпускнікі нашага універсітэта.

Кіраўніцтва БДУ наведала новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі. Пасля экскурсіі рэктар, прафесар В. Стражаў пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей бібліятэкі.

Прарэктар БДУ Уладзімір Сувораў прыняў удзел у святкаванні 60-годдзя Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта.

Хлеб "Агеньчык" з вітамінна-мінеральным комплексам "Арбарвіт-1", распрацаваным хімікамі цэнтра харчовых дабавак УП "Унітэхпрам" БДУ, атрымаў Гран-пры на II міжнароднай спецыялізаванай выставе "Хлебная і кандытарская справа", якая адбылася ў Мінску ў другой палове верасня.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2005–2006 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ НА 2006–2007 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

***На пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ, якое адбылося 18 верасня, з асноўным дакладам на тэму «Вынікі работы БДУ ў 2005-2006 навучальным годзе і задачы на 2006-2007 навучальны год» выступіў рэктар нашага універсітэта, прафесар В.І. Стражаў. Прапануем вашай увазе некаторыя палажэнні даклада ў табліцах і дыяграмах з каментарыямі рэктара.***

### Узроставая дынаміка прафесарска-выкладчыцкага саставу БДУ




З гэтай дыяграмы відавочна, што ў нас, на жаль, назіраецца тэндэнцыя, якая выявілася ў тым, што колькасць ПВС, якія маюць узрост вышэйшы за 60 гадоў, расце. Адначасова змяншаецца колькасць супрацоўнікаў ва ўзросце да 29 гадоў. Гэтае пытанне мы ўжо абмяркоўвалі год таму. Хачу яшчэ раз падкрэсліць: працаваць павінен не толькі той, хто хоча, а той хто здольны. Заўсёды цэніцца кваліфікаваная і высокапрафесійная праца. Але, на жаль, у БДУ расце колькасць выкладчыкаў ва ўзросце больш за 60 гадоў, у якіх няма вучоных ступеняў і званняў. Таму ў гэтай сітуацыі трэба спакойна разбірацца ў кожным канкрэтным выпадку і зрабіць неабходныя захады.

### Колькасць аспірантаў і дактарантаў (2001-2006 г.)




| | Аспірантура | | | | Дактарантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вочная | завочная | разам | У тым ліку мэтавая (вочн./завочн.) | Дактаранты БДУ | Дактаранты іншых арг. | разам |
| 2001 | 524 | 259 | 783 | 46 / 15 | 8 | 11 | 19 |
| 2002 | 544 | 286 | 830 | 50 / 24 | 7 | 13 | 20 |
| 2003 | 535 | 298 | 833 | 60 / 34 | 6 | 10 | 16 |
| 2004 | 469 | 298 | 767 | 48 / 38 | 6 | 9 | 15 |
| 2005 | 474 | 304 | 778 | 49 / 35 | 6 | 10 | 16 |
| 2006 (на 01.09) | 429 | 246 | 673 | 45 / 44 | 7 | 12 | 19 |

### Навуковыя публікацыі супрацоўнікаў БДУ ў 2001-2005 г.

| Колькасць публікацый | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 |
|---|---|---|---|---|---|
| разам | 722 | 783 | 1003 | 896 | 892 |
| манаграфій | 97 | 144 | 160 | 113 | 100 |
| падручнікаў і навучальных дапаможнікаў | 385 | 437 | 537 | 532 | 517 |
| зборнікаў навуковых прац | 61 | 51 | 100 | 65 | 58 |
| зборнікаў тэзісаў дакладаў | 26 | 36 | 74 | 33 | 22 |
| іншых выданняў | 153 | 115 | 132 | 153 | 195 |

Назіраецца трывожная тэндэнцыя памяншэння колькасці маладых кадраў у БДУ. Гэта адлюстроўваецца і на тым, што навуковыя школы "старэюць". І неабходна думаць пра тое, каб у БДУ было каму працягваць нашыя моцныя навуковыя традыцыі.

### Звесткі пра колькасць работнікаў БДУ

| падраздзяленне | на пастаяннай аснове | | | знешнія сумяшчальнікі | | | унутраныя сумяшчальнікі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | разам | д/навук | к/навук | разам | д/навук | к/навук | разам | д/навук | к/навук |
| КОМПЛЕКС БДУ | 7511 | 277 | 1325 | 1082 | 142 | 355 | 1484 | 125 | 429 |
| у тым ліку: БЮДЖЭТ: | 6588 | 270 | 1224 | 843 | 117 | 283 | 1214 | 118 | 339 |
| апарат кіравання | 962 | 29 | 64 | 44 | 3 | 3 | 35 | | 2 |
| прафесарска-выклад.састаў | 1869 | 206 | 886 | 479 | 97 | 233 | 261 | 24 | 118 |
| навуковыя супрацоўнікі | 675 | 33 | 237 | 107 | 17 | 42 | 381 | 93 | 214 |
| ІТР | 591 | | 3 | 86 | | | 159 | | |
| Вучэбна-дапам. персанал | 1033 | 2 | 32 | 24 | | 3 | 127 | 1 | 5 |
| гасп.-абсл.персанал | 1271 | | 2 | 90 | | 2 | 248 | | |
| рабочыя | 187 | | | 13 | | | 3 | | |
| ПАЗАБЮДЖЭТ: | 923 | 7 | 101 | 239 | 25 | 72 | 270 | 7 | 90 |
| апарат кіравання | 161 | 1 | 14 | 4 | | 1 | 36 | | 2 |
| прафесарска-выклад.састаў | 425 | 6 | 87 | 211 | 25 | 70 | 199 | 7 | 87 |
| ІТР | 68 | | | 7 | | | | | |
| вучэб.-дапам.персанал | 93 | | | 9 | | | 19 | | |
| гасп.-абсл.персанал | 173 | | | 8 | | 1 | 16 | | 1 |
| рабочыя | 3 | | | | | | | | |

### Звесткі пра сярэднюю заработную плату работнікаў БДУ (2001-2005 гг.)




Сярэдняя заработная плата, напрыклад, работнікаў ПВС уключае ў сябе і грошы за сумяшчальніцтва, і пагадзінную аплату, і аплату за навуковую дзейнасць — усю суму, якую атрымлівае супрацоўнік праз касу БДУ. Гэта без уліку грошай, якія выкладчыкі атрымліваюць ад юрыдычных асоб БДУ. У графіку прыведзены лічбы разам з падаткам, які неабходна выплаціць. Дарэчы, гэта сусветная статыстычная практыка, калі заработная плата падаецца без уліку сумы падатку. Па росце заработнай платы ў БДУ ёсць станоўчая тэндэнцыя. У першую чаргу, гэта абумоўлена павышэннем бюджэтнай стаўкі, акрамя таго трэба ўлічваць уклад пазабюджэтных сродкаў, а таксама павелічэнне фінансавання навуковай сферы універсітэта. Так, можна прасачыць, што ў параўнанні, напрыклад, з 2003 годам сярэдні заробак павысіўся прыкладна ў 2 разы. Трэба яшчэ ўлічваць, што да 2003 года інфляцыя перавышала 100 %, у 2003 годзе інфляцыя складала 25 %, у 2004 — 12%, у 2005 — 9 %, у гэтым годзе чакаецца каля 8 %. Так што з улікам інфляцыі зарплата ўзрасла нават больш, чым у два разы.

### Сярэдняя нагрузка выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта




У цэлым па БДУ сярэдняя аўдыторная нагрузка складае 50 % ад агульнай. З улікам 34 навучальных тыдняў лёгка падлічыць, што ў тыдзень гэта складае ў сярэднім 10 гадзін. Зразумела, што гэта сярэдняя лічба, і на кожным факультэце свая спецыфіка. Але калі параўнаць нашу сярэднюю аўдыторную нагрузку з іншымі ВНУ, то атрымліваецца, што ў нас яна прыкладна напалову меншая.

### Звесткі пра кантынгент студэнтаў БДУ дзённай формы навучання па курсах *на 01.09.2006*

| курс | бюджэт | платнае | разам |
|---|---|---|---|
| 1 | 1910 | 1965 | 3875 |
| 2 | 1993 | 1838 | 3831 |
| 3 | 1973 | 1695 | 3668 |
| 4 | 1830 | 1166 | 2996 |
| 5 | 1810 | 874 | 2684 |

### Звесткі пра кантынгент студэнтаў БДУ па гадах




З гэтых табліц можна бачыць, што расце колькасць студэнтаў БДУ. Неабходна заўважыць, што з улікам уводзення ў 2007-2008 навучальным годзе корпуса па вул. Кальварыйскай, а гэта будзе ўжо складаць чвэрць ад усіх навучальных плошчаў БДУ, ёсць неабходная матэрыяльная база для росту. Такім чынам, будзе магчымасць навучаць ва універсітэце каля 25 000 студэнтаў — 20 000 на дзённай форме навучання і 5000 на завочнай.

### Сродкі камп'ютарнай тэхнікі: дынаміка аснашчэння




- Практычна ўся камп'ютарная тэхніка, якая набываецца ў 2005-2006 г., накіроўваецца на забеспячэнне навучальнага працэсу
- Гарманічнае спалучэнне разнастайных арганізацыйных формаў выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі ў навучальным працэсе: агульнауніверсітэцкія медыятэкі + факультэцкія класы + кафедры
- Упершыню за апошнія 7 гадоў набылі новыя вялікія капіравальныя апараты для забеспячэння навучальнага працэсу
- У 2005/2006 навучальным годзе набыта:
  - 13 відэапраектараў
  - 40 сканераў
  - 38 прынтараў
  - 12 шматфункцыянальных капіравальных апаратаў

### Тэлекамунікацыйная інфраструктура: дынаміка развіцця







За апошні навучальны год мы значна палепшылі камп'ютарнае забеспячэнне ў БДУ. Гэта ўсё знаходзіцца ў рэчышчы выканання праграмы па самастойнай рабоце студэнтаў, якая ў значнай ступені грунтуецца на выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій. Гэта дапамагае кантраляваць засваенне матэрыялу, а таксама пашырае магчымасці студэнтаў па выкарыстанні электронных навучальных матэрыялаў для самастойнай працы. Надалей мы таксама будзем надаваць гэтаму шмат увагі.

Паступленне сродкаў у навуковую і навукова-тэхнічную сферу БДУ ў 2001-2006 г. (млн руб.)

| | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 (план) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Агульны аб'ём фінансавання | 9819,2 | 11867,9 | 15028,5 | 20669,1 | 26894,4 | 31500.0 |
| *у тым ліку:* | | | | | | |
| - фундаментальныя даследаванні | 1522,5 | 1814,0 | 2753,2 | 4156,5 | 5521,5 | 7154,2 |
| - ДНТП, інавацыйныя праекты | 3527,2 | 3854,8 | 5431,7 | 7366,9 | 8835,4 | 9298,3 |
| - гасдагаворы | 1504,5 | 2488,0 | 3014,9 | 4433,3 | 3421,0 | 3760,0 |

**Бюджэтныя асігнаванні комплексу БДУ за перыяд з 2001-2006 г. (у млн руб., тыс.$ ЗША)**




| Гады | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006(план) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Асігнаванні ў млн руб | 29337,9 | 34552,2 | 60633,2 | 70629,0 | 96758,2 | 102202,4 |
| тыс. доларау ЗША | 21274,8 | 19367,8 | 29562,7 | 32698,6 | 44920,0 | 47624,6 |

З гэтага графіка відаць, што дзяржава аказвала і працягвае аказваць значную падтрымку ў развіцці БДУ. Гэта і бюджэтнае фінансаванне павышанага ўзроўню заработнай платы, пашыны ўзровень стыпендыі ў параўнанні з іншымі ВНУ, і ўклад сродкаў у развіццё інфраструктуры універсітэта, капітальны рамонт і рэканструкцыю, будаўніцтва новых аб'ектаў.

**Конкурсы сярод паступаючых у БДУ на 1-ы курс дзённай формы навучання (2001-2006 г.)**

| Год | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Конкурс | 3,45 | 3,5 | 3,1 | 4,2 | 3,94 | 2,59 |

**Студэнты, залічаныя на 1-ы курс па гадах**




| год | | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго студэнтаў у БДУ | 2909 | 3011 | 3098 | 3762 | 3952 | 3897 |
| залічана | на дзённую бюджэтную форму навучання | 1872 | 1874 | 1899 | 2000 | 2006 | 1901 |
| | на платную форму навучання | 1037 | 1137 | 1199 | 1762 | 1946 | 1996 |

У гэтым годзе прыёмная кампанія ў цэлым была паспяховай. А што тычыцца некаторых спецыяльнасцей фізічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі, на якія назіраўся недабор, лічу, што неабходна больш увагі надаваць прафарыентацыйнай рабоце.

Звесткі аб размеркаванні выпускнікоў БДУ дзённай формы навучання, якія вучыліся за кошт бюджэтных сродкаў у перыяд з 2002 г. па 2006 г.




У краіне рыхтуецца Закон аб вышэйшай адукацыі, дзе ўводзіцца паняцце аб абавязковым размеркаванні. Гэта азначае абавязковасць размеркавання не толькі для выпускнікоў, але і абязковасць для самой ВНУ, каб выпускнікі былі запатрабаваныя. Таму структура прыёму ў БДУ будзе пераглядацца, каб пасля навучання ў нашых выпускнікоў былі працоўныя месцы. Што тычыцца педагагічных спецыяльнасцяў, тут мы арыентуемся на Міністэрства адукацыі, у астатніх выпадках большая адказнасць будзе ў кафедраў, якія рыхтуюць адпаведных спецыялістаў.

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ВУЧОНЫ САВЕТ БДУ ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ

***2 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета БДУ, на якім было працягнута абмеркаванне даклада рэктара «Вынікі работы БДУ ў 2005-2006 навучальным годзе і задачы на 2006-2007 навучальны год». Вучоны савет прыняў за аснову праект рашэння, які мы прапануем вашай увазе.***

Вучоны савет вырашыў:

**1.** Выпускаючым кафедрам і дэканатам факультэтаў актывізаваць работу па працаўладкаванні выпускнікоў універсітэта. З 2006/2007 навучальнага года ўвесці ў практыку правядзенне ў студзені—сакавіку кірмашоў прафесій з запрашэннем заказчыкаў спецыялістаў, падрыхтаваць і выдаць кароткія кваліфікацыйныя характарыстыкі выпускнікоў па спецыяльнасцях для рассылкі іх у зацікаўленыя арганізацыі (адказныя — прарэктары па вучэбнай рабоце, ГУВіНМР, кіраўнікі вучэбных падраздзяленняў).

**2.** На працягу 2006/2007 навучальнага года абнавіць праграмы вытворчай практыкі студэнтаў па спецыяльнасцях і спецыялізацыях, ажыццявіць меры па праходжанні яе па месцы будучай працы (адказныя — прарэктары па вучэбнай рабоце, ГУВіНМР, кіраўнікі вучэбных падраздзяленняў).

**3.** Да 15 лістапада 2006 г. распрацаваць мерапрыемствы па стварэнні ўмоваў для працягу вывучэння замежных моваў студэнтамі старэйшых курсаў на платнай аснове (адказныя — ГУВіНМР, ГУПБУіФ, ІСДМПА).

**4.** Прыняць да 1 снежня 2006 г. комплекс мер па ўдасканаленні камп'ютарнай адукаванасці студэнтаў усіх спецыяльнасцяў, для чаго распрацаваць асобныя праграмы з рознымі тэрмінамі навучання ў залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці студэнта (адказныя — ЦІТ, ГУВіНМР).

**5.** Удасканаліць сістэму разліку колькасці штатаў ПВС па факультэтах і агульнауніверсітэцкіх кафедрах з мэтай прывядзення колькасці выкладчыкаў у адпаведнасць з усталяванымі ў БДУ нарматывамі. Разлік штатаў ПВС на чарговы год праводзіць да 15 красавіка бягучага года пасля зацвярджэння кантрольных лічбаў прыёму на 1-ы курс (адказныя — ГУВіНМР, ГУПБУіФ).

**6.** Штогадовую атэстацыю прафесарска-выкладчыцкага саставу прывесці ў прамую залежнасць ад зробленага ўнёску ў рэалізацыю "Праграмы ўдасканальвання арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў" (адказныя — старшыні атэстацыйных камісій).

**7.** Распрацаваць да 1 снежня 2006 г. праграму прыцягнення найбольш таленавітых выпускнікоў універсітэта на педагагічную і навуковую работу (адказныя — прарэктары па вучэбнай і навуковай рабоце, упраўленне кадраў).

**8.** Абмеркаваць на факультэтах да 30 кастрычніка 2006 г. вынікі сацыялагічнага апытання студэнтаў і распрацаваць меры па ўдасканаленні арганізацыі навучальнага працэсу з улікам заўваг і прапановаў, выказаных студэнтамі (адказныя — дэканаты факультэтаў, дырэкцыі ДзІКСТ, ІБМТ).

**9.** Факультэтам, якія праводзяць экзамен па профільным прадмеце сярод паступаючых на першы курс, распрацаваць да 1 снежня 2006 г. спецыяльную праграму прафарыентацыйнай работы ў школах рэспублікі (адказныя — дэканаты факультэтаў).

**10.** Працягнуць у 2006/2007 навучальным годзе практыку абмеркавання на пасяджэннях Вучонага савета і рэктарата справаздач кіраўнікоў структурных падраздзяленняў аб рабоце па рэалізацыі праграм развіцця універсітэта з праверкай дзейнасці падраздзялення адпаведнымі камісіямі (адказныя — рэктар, прарэктары).

# КАМЕНТАРЫЙ ДА РАШЭННЯ ВУЧОНАГА САВЕТА

***Газета «Універсітэт» звярнулася да рэктара БДУ, прафесара В.Стражава з просьбай пракаменціраваць рашэнне Вучонага савета:***

— На працягу двух апошніх гадоў у БДУ праводзілася сацыялагічнае апытанне студэнтаў 2-4 курсаў. Як у мінулым, так і ў гэтым годзе высветліліся тры асноўныя праблемы, якія хвалююць студэнтаў і якія неабходна вырашыць ва універсітэце. Першае, што хвалюе студэнтаў, — авалодванне за час навучання практычнымі навыкамі, звязанымі з будучай прафесіяй. Другое — свабоднае валоданне замежнай мовай. Трэцяе — свабоднае валоданне камп'ютарам. Таму некаторыя пункты пастановы Вучонага савета і накіраваны на вырашэнне гэтых задач. Але што тычыцца прафесійнай падрыхтоўкі і практычных навыкаў — гэта задача выкладчыкаў, адпаведнай арганізацыі навучальнага працэсу, а вось авалодаць замежнай мовай можна толькі тады, калі ёсць неабходнае жаданне. І тут вельмі важна самастойнасць студэнта, яго матывацыя. У нас прадугледжана вывучэнне замежнай мовы толькі на І-ІІІ курсах. Лічу, што ў рамках БДУ мы павінны ствараць умовы для ўдасканалення замежных моў за адносна невялікую плату не толькі для студэнтаў старэйшых курсаў, але і для ўсіх жадаючых. І за гэты навучальны год мы будзем імкнуцца гэтую працу наладзіць. Гэта ўсё тычыцца і авалодвання камп'ютарамі. Ва універсітэце для гэтага ствараюцца ўмовы. Акрамя медыятэк, мы можам адкрываць і дадатковыя вучэбныя заняткі, зноў жа за невялікія грошы, для тых, хто хоча больш дасканала асвоіць камп'ютар.

Пункты 5, 6 і 7 звязаныя як з выкананнем праграм развіцця універсітэта, так і з забеспячэннем найбольшай эфектыўнасці работы прафесарска-выкладчыцкага саставу.

## АКТУАЛЬНА

# ЧАМУ ВЫРАСЛА ПЛАТА ЗА НАВУЧАННЕ

***Інфармацыя пра тое, што плата за навучанне ў БДУ павысілася, выклікала жывы інтарэс, таму рэктар універсітэта, прафесар Васіль Стражаў сустрэўся с журналістамі і адказаў на іх пытанні.***

— Памыляюцца тыя, хто лічаць, што яны поўнасцю аплачваюць сваю вучобу, — сцвярджае Васіль Іванавіч. — Хочаце даведацца рэальны кошт свайго навучання — паглядзіце, колькі плацяць замежныя студэнты (іх вучобу ніхто не дацірує), а гэтая сума складае 1700—2500 долараў.

Усіх цікавіць, на што ідуць грошы платнікаў. На зарплату выкладчыкаў, накладныя выдаткі і вельмі невялікі працэнт рэнтабельнасці, пры гэтым не ўлічваюцца капітальны рамонт існуючых будынкаў і ўзвядзенне новых, закупкі абсталявання і г.д.

Вось і лічыце: паднялася заработная плата работнікаў ва ўсёй краіне (а значыць, і выкладчыкаў БДУ) — прыбавілася нешта і да кошту навучання. У сярэднім па БДУ плата за навучанне для студэнтаў ІІ-IV курсаў павысілася на 6 %.

Дарагоўля навучання на факультэце міжнародных адносінаў тлумачыцца вялікім попытам і вывучэннем студэнтамі дзвюх моў (гэтыя дысцыпліны вывучаюцца ў значнай ступені аўдыторна, а значыць, даводзіцца задзейнічаць мноства выкладчыкаў і, вядома, небясплатна).

Сёлета 93 студэнты БДУ былі пераведзеныя на бюджэтную форму навучання, скідкі атрымалі 808 чалавек, што складае 16 % ад агульнай колькасці платнікаў, а значыць — кожны шосты.

На скідкі могуць разлічваць студэнты, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай рабоце: пры сярэднім бале паспяховасці ад 7.46 да 8.25 прадугледжана скідка 20 %, ад 8.25 да 9.0 — 40 %, а калі сярэдні бал вашай залікоўкі вышэйшы за 9.0, вы можаце прэтэндаваць на 60-працэнтнае паніжэнне аплаты.

Усе ільготы, зацверджаныя ва Указе Прэзідэнта №126 ад 28 лютага 2006 г., захаваліся (у прыватнасці, на скідкі могуць разлічваць інваліды, чарнобыльцы, выхаванцы шматдзетных сем'яў).

**Ала МАЧАЛАВА**

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

***Калі завяршыцца будаўніцтва корпуса факультэта міжнародных адносін? Колькі ён каштуе універсітэту?***

Як паведамілі "Універсітэту" ў дырэкцыі аб'ектаў БДУ, якія будуюцца, будынак факультэта міжнародных адносін на Прывакзальнай плошчы будзе мець 14 паверхаў, калі лічыць ад узроўню зямлі. Пад часткай будынка мяркуецца яшчэ два падземныя паверхі. Плануецца, што аб'ект будзе здадзены ў эксплуатацыю ў першым квартале 2008 года. Будаўніцтва вядзецца ў крэдыт, які ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў 2001 года і ўмовамі, падпісанымі БДУ, аплачваецца як дзяржавай, так і універсітэтам. На сёння затраты БДУ на гэтае будаўніцтва склалі 4 859 436 еўра, затраты міністэрства фінансаў — 4 947 154 еўра. Разам гэта складае каля паловы ўсіх выдаткаў, запланаваных на будаўніцтва. Прыкладна такія ж сумы і ў такой прапорцыі яшчэ давядзецца на гэта патраціць.

**Тэлефон «Гарачай лініі» 209-54-16.**

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ–2006 У БДУ

***Скончыўся гарачы час уступных іспытаў. Студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта сталі 3897 абітурыентаў, з якіх на дзённую бюджэтную форму навучання паступіў 1901 чалавек.***

Пра маштаб працы прыёмнай камісіі можна меркаваць паводле наступных лічбаў. На бюджэтную форму навучання было пададзена 5640 заяваў. Да правядзення ўсёй уступнай кампаніі былі прыцягнутыя 205 выкладчыкаў БДУ ў складзе 13 экзаменацыйных камісіяў. У 2006 г. набор у БДУ ажыццяўлялі 16 факультэтаў і 3 інстытуты па больш чым 90 спецыяльнасцях, напрамках і спецыялізацыях. У прыёме дакументаў былі задзейнічаныя больш за 140 супрацоўнікаў тэхнічнага сакратарыята, 26 апeратараў лічбавага фатаграфавання, 36 чалавек групы па эксплуатацыі камп'ютарнай і арганізацыйнай тэхнікі. Для павелічэння эфектыўнасці прыёму дакументаў была створаная грамадская прыёмная камісія са студэнтаў універсітэта, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку. Больш за 140 студэнтаў дапамагалі абітурыентам запаўняць неабходныя дакументы.

Галоўнай асаблівасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі стала тое, што ўпершыню Указам Прэзідэнта Беларусі А.Лукашэнкі былі зацверджаныя адзіныя "Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы". Паводле гэтых правілаў, усе ВНУ, у тым ліку і недзяржаўныя (за выключэннем вайсковых і творчых), былі аб'яднаныя ў адну плынь. Цэнтралізаваныя тэсты сталі асноўнай формай уступных экзаменаў, прычым абітурыенты мелі магчымасць прайсці тэсты толькі па трох прадметах. Паколькі рэгістрацыя на тэсты адбывалася ў маі, абітурыент павінен быў ужо на гэты момант вызначыцца з профілем будучай спецыяльнасці.

У адпаведнасці з правіламі прыёму ВНУ маюць магчымасць правесці адзін профільны экзамен. Гэтае палажэнне прывяло да таго, што ў ВНУ краіны па 15 % спецыяльнасцяў, у тым ліку творчыя, праходзілі профільныя іспыты ў вузаўскай форме. Большасць ВНУ прымалі толькі сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання. У БДУ тры сертыфікаты цэнтралізаваных тэстаў прымаліся на эканамічным, юрыдычным факультэтах, шэрагу спецыяльнасцяў гуманітарнага факультэта, факультэце філасофіі і сацыяльных навук, факультэце міжнародных адносінаў, Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій, Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогіяў. Профільны экзамен праводзіўся на спецыяльнасцях прыродазнаўчых факультэтаў, філалагічнага і гістарычнага факультэтаў. Гэтая акалічнасць, вядома, адыграла сваю ролю ў падзенні конкурсу на прыродазнаўчых факультэтах.

Сур'ёзныя змены адбыліся ў арганізацыі прыёму на завочную форму навучання: у конкурсе на бюджэтную форму маглі ўдзельнічаць толькі абітурыенты, якія альбо працавалі, альбо скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы па адпаведнай спецыяльнасці.

Пры залічэнні на ўсе формы навучання цяпер улічваецца сярэдні бал дакумента аб адукацыі.

Далёка не ўсе абітурыенты і іх бацькі змаглі цалкам разабрацца з асаблівасцямі сёлетніх правілаў прыёму. Канечне, гэта выклікала пэўныя хваляванні і нервовасць. Кансультацыйную дапамогу абітурыентам пастаянна аказвалі работнікі сакратарыята, дапамагаючы разабрацца ў складаных сітуацыях. Эфектыўна працавала і юрыдычная служба прыёмнай камісіі. Многія пытанні абітурыентаў і іх бацькоў былі вырашаныя падчас дзвюхгадзіннай прэс-канферэнцыі, якую зладзілі члены сакратарыята.

Прыёмная кампанія ў ВНУ, як заўжды, была пад пільнай увагай дзяржавы: камісію па кантролі за ходай падрыхтоўкі і правядзення ўступных экзаменаў у БДУ ўзначальваў міністр унутраных справаў Беларусі У. Навумаў. Да працы прадметных камісіяў прыцягваліся члены рэзервовых экзаменацыйных камісіяў: у прыватнасці, праверку пісьмовых работ абітурыентаў, якія паступалі ў юрыдычны каледж БДУ на аснове базавай адукацыі, ажыццяўлялі толькі члены рэзервовай камісіі.

Як і ў мінулыя гады, у перыяд прыёму дакументаў выкарыстоўвалася сістэма электроннай падрыхтоўкі экзаменацыйных лістоў з нанясеннем лічбавай фатаграфіі абітурыентаў і аўтаматычным унясеннем адзнак сертыфікатаў цэнтралізаваных тэстаў. Гэта дазволіла паскорыць апрацоўку дакументаў, павысіць ступень абароны і максімальна пазбегнуць тэхнічных памылак. Гэтая тэхналогія з'яўляецца адным з элементаў сістэмы электроннай ідэнтыфікацыі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, якая цяпер укараняецца ва універсітэце. Гэтак зроблены яшчэ адзін крок да ўкаранення беспапяровай тэхналогіі ў арганізацыі дзейнасці ВНУ, якая цяпер актыўна ўкараняецца ў вядучых вышэйшых навучальных установах свету.

Прыёмная камісія аператыўна змяшчала інфармацыю па ўсіх спецыяльнасцях з указаннем сумы набраных балаў не толькі на інфармацыйных стэндах, але і на спецыяльнай старонцы сайту БДУ, трансліравала на вялікім экране ў фае галоўнага корпуса. Напрыклад, у апошні дзень падачы дакументаў інфармацыя пра конкурс і размеркаванне балаў абнаўлялася на інфармацыйным табло 12 разоў.

Беларускі дзяржаўны універсітэт указам прэзідэнта быў прызначаны каардынацыйным цэнтрам для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па Мінску, у якім размяшчаюцца 32 пункты тэсціравання. На базе універсітэта адбываліся тэсты па 6 прадметах у

Паступленне на дзённую бюджэтную форму ў 2006 г. па рэгіёнах




чэрвені і па 14 прадметах у рэзервовы дзень 12 ліпеня. Агульная колькасць зарэгістраваных абітурыентаў у БДУ склала 18 391 чалавек, а ў тэстах прынялі ўдзел 17 354 чалавек. Для правядзення цэнтралізаваных тэстаў былі прыцягнутыя больш за 420 выкладчыкаў універсітэта.

На дзённую форму навучання было пададзена 4930 заяваў на 1936 планавых месцаў, на завочную — 686 заяваў на 450 месцаў. Сярэдні конкурс па універсітэце на дзённую форму склаў 2,5 чалавека на месца, на завочную форму — 1,5.

У параўнанні з мінулым годам сёлета адбылося значнае зніжэнне конкурсу. Гэта тлумачыцца тым, што паралельна з нашым універсітэтам у тыя ж тэрміны, як ужо адзначалася, праводзілі ўступныя іспыты амаль усе ВНУ краіны. Таму частка абітурыентаў, якая ў мінулыя гады мела магчымасць спярша выпрабаваць сябе пры паступленні ў БДУ, а потым, у выпадку няўдачы, паўтарыць спробу ў іншыя ВНУ, сёлета

**Звесткі пра залічэнне на дзённую бюджэтную форму навучання**

| | План | Залічана | У тым ліку | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | без экзаменаў | па-за конкурсам | па мэтавым прыёме | толькі па сертыфікатах ЦТ | па сертыфікатах ЦТ і профільным экзамене |
| Разам | 1936 | 1901 | 130 | 75 | 16 | 499 | 1223 |
| в % | | 98 % | 7 % | 4 % | 1 % | 26 % | 63 % |

была вымушаная вызначыцца са сваім выбарам адразу ў ліпені. Сказалася і тая акалічнасць, што многія абітурыенты пабаяліся ўдзельнічаць у профільным універсітэцкім экзамене, маючы на руках гарантаваныя балы сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання.

Тым не менш, на асобных спецыяльнасцях конкурс вырас у параўнанні з мінулым годам. Рэкорд пабіла спецыяльнасць "дызайн" (напрамак камунікатыўны дызайн): конкурс тут стаў самым вялікім у Беларусі — 19,6 чалавека на месца. Агулам па 12 спецыяльнасцях гуманітарных факультэтаў конкурс аказаўся вышэй за 5 чалавек на месца, у тым ліку:

— дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў) — 12,6;
— паліталогія — 9,3;
— сацыялогія (гуманітарны факультэт) — 8;
— міжнароднае права — 7,2;
— міжнародныя адносіны — 6,8;
— менеджмент (ДзІКСТ) — 6,5;
— менеджмент (гуманітарны факультэт) — 5,4;
— псіхалогія (гуманітарны факультэт) — 5,4;
— бізнес-адміністраванне — 5,3;
— сучасныя замежныя мовы (гуманітарны факультэт) — 5,2.

Толькі на дзве спецыяльнасці прыродазнаўчага профілю конкурс аказаўся 4 і больш чалавек на месца: інфарматыка (WEB-дызайн; 4,4 чалавека) і біяэкалогія (4 чалавекі). Разам з тым на спецыяльнасці механіка-матэматычнага факультэта пры плане набору 160 чалавек у конкурсе ўдзельнічалі 164 абітурыенты, на спецыяльнасці фізічнага факультэта, адпаведна, 114 чалавек на 125 месцаў, факультэта РФіЭ — 123 чалавекі на 130 месцаў. Такі нізкі конкурс і прывёў да таго, што ўпершыню за многія гады па дзвюх спецыяльнасцях (фізіка і фізічная электроніка) адбыўся недабор на бюджэтную форму навучання.

Як заўжды, высокі конкурс быў у юрыдычным каледжы БДУ на аснове базавай адукацыі: на 50 месцаў было 860 прэтэндэнтаў.

У параўнанні з мінулымі гадамі зменшылася колькасць заяваў, пададзеных медалістамі. Гэта тлумачыцца зменамі ў парадку ўзнагароджання выпускнікоў школаў залатымі і срэбранымі медалямі.

Профільны экзамен у БДУ здавалі 2386 абітурыентаў, вытрымалі яго 2177 чалавек, што складае 91,2 %. Вынікі неблагія, калі ўлічыць, што ўзровень патрабаванняў прадметных камісій быў вельмі высокім. Так, самыя высокія балы (8, 9, 10) склалі 22,5 % ад усіх атрыманых адзнак, а нездавальняючыя адзнакі атрымалі 8,2 %. Прадметныя камісіі традыцыйна добразычліва ставіліся да абітурыентаў, імкнуліся растлумачыць усе недахопы і памылкі ў адказах. Па выніках праведзеных экзаменаў былі пададзеныя толькі 4 апеляцыі, якія не прывялі да пераацэнкі адзнак.

Прахадны бал па многіх спецыяльнасцях аказаўся вельмі высокім і ў суме трох іспытаў і сярэдняга бала атэстата перавысіў 300. Найбольш высокія прахадныя балы зафіксаваныя на наступных спецыяльнасцях: сусветная эканоміка (357), лінгвакраіназнаўства (342), мытная справа (333), міжнароднае права (331), міжнародныя адносіны (330).

Сярод творчых спецыяльнасцяў, дзе творчы экзамен праводзіўся ў два этапы і, адпаведна, выстаўляліся дзве адзнакі, прахадныя балы склалі: камунікатыўны дызайн — 41,7, дызайн прадметна-прасторавых комплексаў — 39,4, журналістыка — 36,5.

Абагуленыя звесткі пра залічэнне на дзённую бюджэтную форму навучання падаюцца ў табліцы.

Варта зазначыць, што універсітэт выканаў план мэтавага кантрактнага набору. Але пры гэтым рэальны конкурс на "мэтавыя" месцы аказаўся толькі на факультэце журналістыкі. На спецыяльнасці "хімія", "матэматыка", "руская філалогія", "псіхалогія" конкурсу на мэтавыя месцы не было ўвогуле.

Якасны склад студэнтаў першага курса дзённай бюджэтнай формы навучання дастаткова высокі: сярэдні бал атэстата абітурыентаў, залічаных на першы курс, складае 8,3. Прычым на шэрагу спецыяльнасцяў гэты паказчык быў значна вышэйшым. Так, па спецыяльнасцях "міжнароднае права", "сусветная эканоміка", "міжнародныя адносіны", "менеджмент", "фінансы і крэдыт" ён склаў 9,2—9,4.

У бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, абітурыенты, якія скончылі вясковыя школы, паступалі паводле асобнага конкурсу. У прыёмную камісію паступіла 510 заяваў ад выпускнікоў вясковых школаў. Гэта значна менш, чым у мінулым годзе, калі былі пададзеныя 992 заявы. Адпаведна, і колькасць тых, хто паступіў, была меншай: 218 супраць 253. Гэта склала 11,5 % ад агульнай колькасці залічаных на дзённую бюджэтную форму (у 2005 г. гэты лік склаў 12,6 %). Але нягледзячы на змяншэнне рэальнай колькасці залічаных вясковых выпускнікоў, выявілася іншая тэндэнцыя: упершыню працэнт залічаных вясковых абітурыентаў ад колькасці тых, хто падаў заявы, дасягнуў вельмі высокага ўзроўню — 43 %, а ў мінулыя гады ён вагаўся ад 22 % да 25 %. Узровень падрыхтоўкі вясковых абітурыентаў, якія паступаюць ва універсітэт, дастаткова высокі. Пра гэта кажа і такі факт: па 19 спецыяльнасцях абітурыенты, якія скончылі вясковыя школы, набралі больш высокі прахадны бал, чым гарадскія школьнікі, таму на гэтых спецыяльнасцях праводзіўся агульны конкурс.

Вынікі прыёмнай камісіі паказалі яшчэ адну тэндэнцыю: БДУ не з'яўляецца навучальнай установай толькі для мінчукоў. Калі ў 2001 г. сярод залічаных было больш за 52 % выпускнікоў сталічных школаў, то ў 2005 г. іх лік склаў амаль 39 %, а сёлета — 36,6 %. Павялічылася колькасць тых, хто паступіў з Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай абласцей.

**Якасны склад студэнтаў першага курса дзённай бюджэтнай формы навучання**

| Форма навучання | Разам | З іх | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | медалісты і дыпломы з адзнакай | % | пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, лаўрэаты Прэзідэнцкага фонду | % | выпускнікі ліцэяў і гімназій | % | у тым ліку выпускнікі ліцэя БДУ |
| 2006 г. | 1901 | 329 | 17 | 130 | 7 | 818 | 43 | 164 |
| 2005 г. | 2006 | 499 | 25 | 154 | 8 | 868 | 43 | 150 |

У якасці пажадання прыёмнай камісіі на 2007 г. хочацца звярнуць увагу на неабходнасць значнага ўзмацнення прафарыентацыйнай работы сярод школьнікаў. Вялікую работу тут праводзіць факультэт дауніверсітэцкай адукацыі, дзе ў 2005/2006 навучальным годзе прайшлі навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні 234 слухачы. Колькасць выпускнікоў ПА, якія паступілі на дзённую бюджэтную форму, у параўнанні з 2005 г. павялічылася ў паўтара разу, на падрыхтоўчых курсах навучаліся больш за 2500 абітурыентаў, а ў рэпетыцыйным тэсціраванні прынялі ўдзел каля 10 000 абітурыентаў. Другі год працуюць вочна-завочныя курсы на базе раённых ліцэяў і гімназій у Браславе, Крупках, Століне, Оршы, дзе прайшлі падрыхтоўку больш за 200 абітурыентаў. Дастаткова эфектыўным было супрацоўніцтва ФДА з Рэспубліканскім цэнтрам прафарыентацыі моладзі: выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта ўдзельнічалі ў 12 Днях абітурыента, арганізаваных цэнтрам у гарадах краіны.

У арганізацыі прафарыентацыйнай работы павінны актыўна ўдзельнічаць усе факультэты і інстытуты. Эфектыўная барацьба на рынку адукацыйных паслуг патрабуе распрацоўкі сучасных інфармацыйных матэрыялаў для абітурыентаў па ўсіх спецыяльнасцях універсітэта, неабходна пашырыць практыку ўдзелу БДУ ў Днях абітурыента, у адукацыйных выставах, якія ладзяцца не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх абласных цэнтрах.

У цэлым варта зазначыць, што прыёмная кампанія ў БДУ прайшла паспяхова. Загадзя спланаваная і добра арганізаваная работа дазволіла звесці да мінімуму ўсе праблемы, якія ўзнікалі ў гэты складаны час. Прыёмная кампанія паказала, што кожны супрацоўнік універсітэта вельмі добра ўяўляў усю важнасць і адказнасць той работы, якая ладзілася прыёмнай камісіяй. Усе службы БДУ лічылі прыярытэтнымі пытанні арганізацыі прыёму.

Неабходна сказаць словы падзякі ўсім супрацоўнікам універсітэта, хто прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання і ўступных іспытаў, за іх самаадданую працу. Хочацца верыць, што новае папаўненне студэнтаў БДУ будзе захоўваць і памнажаць традыцыі універсітэта.

**В.М. МАЛАФЕЕЎ,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі**

## САЦЫЯЛАГІЧНАЕ АПЫТАННЕ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

**Чаму Вы паступілі менавіта ў БДУ**

| | |
|---|---|
| Гэта прэстыжная ВНУ | 42,2 % |
| Тут высокі ўзровень выкладання | 53,9 % |
| Мне параілі знаёмыя, сябры, сваякі | 7,3 % |
| Тут можна атрымаць спецыяльнасць, якая мяне цікавіць | 38,3 % |
| Дыплом БДУ дае магчымасць зрабіць кар'еру, атрымаць добрую пасаду | 32,6 % |
| Іншы адказ | 2,9 % |
| Няма адказу | 0,3 % |

**На Вашу думку, навучанне ў БДУ забяспечыць Вам:**

| | Так | Хутчэй, так | Хутчэй, не | Не | Няма адказу |
|---|---|---|---|---|---|
| Неабходны ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці | 74,7 % | 23,3 % | 1,5 % | | 0,6 % |
| Неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці | 54,3 % | 38,7 % | 5,7 % | 0,6 % | 0,7 % |
| Высокую агульнакультурную эрудыцыю | 47,6 % | 44,5 % | 5,8 % | 1,0 % | 1,0 % |
| Веды замежнай мовы на высокім узроўні | 25,3 % | 49,8 % | 20,5 % | 3,8 % | 0,6 % |
| Навыкі працы з камп'ютарам | 30,1 % | 49,3 % | 15,4 % | 3,9 % | 1,2 % |
| Уменне самастойна папаўняць веды і выкарыстоўваць іх на практыцы | 56,9 % | 37,1 % | 4,1 % | 1,2 % | 0,7 % |
| Неабходныя камунікацыйныя і кіраўніцкія навыкі | 40,6 % | 44,1 % | 12.8 % | 1,9 % | 0,6 % |
| Уменне разбірацца ў жыццёвых сітуацыях | 25,3 % | 46,0 % | 20,5 % | 7,4 % | 0,7 % |

**Пры падрыхтоўцы да паступлення Вы:**

| | |
|---|---|
| Займаліся на платных курсах (напрыклад, замежная мова, гісторыя, матэматыка і інш.) | 21,4 % |
| Займаліся на падрыхтоўчым аддзяленні | 7,3 % |
| Наведвалі рэпетытараў | 59,2 % |
| Рыхтаваліся самастойна (спецыяльная літаратура, бясплатныя факультатывы, Інтэрнэт) | 65,8 % |
| Іншае | 2,0 % |
| Спецыяльна не рыхтаваліся, бо дастаткова было школьнай падрыхтоўкі | 3,8 % |

**Якую форму падрыхтоўкі Вы лічыце самай эфектыўнай?**

| | |
|---|---|
| Заняткі на платных курсах (напрыклад, замежная мова, гісторыя, матэматыка і інш.) | 3,1 % |
| Заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні | 7,7 % |
| Наведванне рэпетытараў | 55,3 % |
| Самастойная падрыхтоўка (спецыяльная літаратура, бясплатныя факультатывы, Інтэрнэт) | 29,3 % |
| Іншае | 1,2 % |
| Няма адказу | 3,5 % |

**Як Вы лічыце, паступленне ва універсітэт павінна адбывацца ў форме:**

| | |
|---|---|
| Уступных экзаменаў | 26,3 % |
| Адзінага тэсціравання | 29,8 % |
| Спалучэння ўступных экзаменаў і тэсціравання | 33,5 % |
| Іншае | 2,0 % |
| Цяжка сказаць | 8,3 % |

**Якія пачуцці Вы адчуваеце з нагоды таго, што з'яўляецеся студэнтам БДУ?**

| | |
|---|---|
| Адчуваю пачуццё гонару | 54.6 % |
| Адчуваю пачуццё перавагі | 5,8 % |
| Адчуваю сябе звычайным студэнтам | 31,3 % |
| Іншае | 7,9 % |
| Няма адказу | 0,4 % |

ВІНШУЕМ!

# ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ – 85 ГАДОЎ

***Беларускі дзяржаўны універсітэт і Фундаментальная бібліятэка БДУ — неад'емныя паняцці. Яны ствараліся адначасова — у кастрычніку 1921 года, раслі, развіваліся разам.***

***БДУ з гонарам носіць званне вядучай ВНУ нашай краіны, а Фундаментальная бібліятэка універсітэта ператварылася ў цэнтр навукі, культуры і адукацыі, які заслужана карыстаецца любоўю студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ.***

***Наша бібліятэка валодае не толькі багатым кнігазборам навучальнай, навуковай і мастацкай літаратуры, але і дзякуючы сучасным тэхналогіям дае магчымасць атрымаць неабходную інфармацыю з самых розных бібліятэчных крыніцаў як унутры краіны, так і замежных. Акрамя таго, творчы калектыў бібліятэкі вядзе вялізную асветніцкую і навуковую работу, арганізоўваючы выставы, канферэнцыі, семінары, беручы ўдзел у міжнародных і карпаратыўных праектах.***

***Безумоўна, без таленавітых прафесіяналаў, а гісторыя Фундаментальнай бібліятэкі БДУ багатая на іх, наша універсітэцкая кніжная скарбонка не заняла б такое важнае і значнае месца ў навуковым і адукацыйным працэсе Беларускага дзяржаўнага універсітэта.***

***Дарагія сябры! Ад імя студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў БДУ прыміце велізарную шчырую падзяку за вашу працу і самыя сардэчныя пажаданні здароўя, шчасця, радасці і творчага натхнення!***

**Рэктар БДУ, прафесар В.І. СТРАЖАЎ**

*Радуе вялікая колькасць выданняў, у тым ліку расійскіх. Да таго ж, бібліятэка прапаноўвае шмат паслуг — ад ксеракапіравання матэрыялаў да самастойнай працы на камп'ютары. Кожны семестр тут ладзяць творчыя вечарыны, сустрэчы, чытанні, дзе ўдзел прымаюць і выкладчыкі, і студэнты.*

**Наталля НАРЫНКЕВІЧ,**
**выкладчык кафедры перыядычнага друку, журфак**

## БІБЛІЯТЭКА – ЧЫТАЧУ

Зала электронных інфармацыйных рэсурсаў прапаноўвае студэнтам карыстацца электронным каталогам бібліятэкі, навуковымі і адукацыйнымі рэсурсамі Інтэрнэт, базамі даных (на CD, DVD-ROM, а таксама даступнымі праз Інтэрнэт), электроннымі дакументамі, якія знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі. Вы можаце заказаць друкаваныя выданні з CD, DVD-ROM для далейшай працы з імі, і кансультацыйную дапамогу ў інфармацыйным пошуку вы таксама знойдзеце тут, у пакоі 210 галоўнага корпуса БДУ. Звязацца з залай можна па тэлефоне 209-50-82, альбо праз e-mail: library@bsu.by, exhibit@bsu.by.

Новым інструментам інфармацыйнага абслугоўвання сталі сайты бібліятэк ВНУ. На іх можна знайсці агульныя звесткі пра бібліятэку, навіны, электронныя каталогі, базы даных, спасылкі на іншыя інфармацыйныя рэсурсы. Адрасы сайтаў 31 бібліятэкі ВНУ змешчаны на http://www.library.bsu.by.

*По патрэбную кнігу можна ўжо не спяшацца ў Нацыянальную бібліятэку... У залах пануе асаблівая атмасфера працавітасці, добразычлівасці і сапраўднай інтэлігентнасці, што прываблівае чытачоў і выклікае ў іх пачуццё глыбокай удзячнасці.*

**Наталля КІСЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, ФФСН**

## ДА ГРАМАДСТВА ВЕДАЎ

***10—12 кастрычніка адбудзецца VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Менеджмент бібліятэк ВНУ: Ад інфармацыйнага грамадства да грамадства ведаў".***

Будуць абмяркоўвацца такія пытанні, як вымярэнне эфектыўнасці працы бібліятэк ВНУ, выкарыстанне электронных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк у навучальным працэсе, у тым ліку праблемы стварэння электронных бібліятэк і аўтарскія правы, выкарыстанне электронных рэсурсаў пры дыстанцыйным навучанні і інш. Не застануцца па-за ўвагай і карпаратыўныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі, што дазваляюць развіваць міжбібліятэчнае супрацоўніцтва. Таксама будуць разглядацца праблемы і дасягненні супрацоўніцтва карыстальніка і бібліятэкара ВНУ, бібліятэкі ў сістэме ідэалагічнай і выхаваўчай работы ВНУ.



## КНІЖНЫЯ ПОМНІКІ КУЛЬТУРЫ




Фонд аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ мае болей за 23 тысячы кніг і дарэвалюцыйных часопісаў. Выданні, што захоўваюцца тут, не адно дзесяцігоддзе карпатліва збіралі энтузіясты. Частка кніг, што складае гонар аддзела, патрапіла сюды з розных навуковых устаноў Беларусі і Расіі. Напрыклад, Навуковая бібліятэка Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта перадала нам 3000 экзэмпляраў. Некаторыя кнігі — дарунак прыватных асоб.

Тут захоўваюцца і выданні са спецфондаў. Гэта тыя выданні, што па розных прычынах былі пэўны час забароненыя. Сярод іх багата кніг, якія маюць навуковую каштоўнасць, як, напрыклад, кніга Вацлава Ластоўскага "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: спроба паясніцельнай кнігопісі ад канца 10 да пачатку 19 ст.". Гэта унікальны агляд больш як 1000 найважнейшых рукапісных дакументаў, грамат і старадрукаваных кніг.

Ёсць у аддзеле калекцыя, звязаная з гісторыяй БДУ. Чытачы могуць пазнаёміцца з працамі першага рэктара Ул. Пічэты і з іншымі выданнямі, якія напісалі прафесары і выкладчыкі універсітэта. Аддзел чакае чытачоў з панядзелка па чацвер з 10 да 17, у пятніцу да 16 гадзін.

**А. КІНЧЫКАВА,**
**загадчык аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі**

# АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ

***Пра тое, як развівалася створаная адначасова з БДУ бібліятэка, распавядае яе дырэктар Пётр Лапо.***

### ПЕРШЫЯ ГАДЫ

Напачатку бібліятэка размяшчалася ў двух маленькіх пакойчыках у былой гімназіі Фальковіча. Наркам асветы краіны перадаў бібліятэцы 40 тысяч тамоў. У 20-я гады вельмі дапамаглі ва ўкамплектаванні фондаў кіраўніцтва рэспублікі, расійскія універсітэты, Акадэмія навук, Цэнтральная Расійская кніжная палата. Бібліятэка пачала атрымліваць абавязковы экзэмпляр усіх выданняў РСФСР, набыла шэраг прыватных кнігазбораў, напрыклад, кнігі, што належалі гісторыку і этнографу А. Сапунову, акадэмікам Я. Карскаму, М. Янчуку ды інш. Уладзімір Пічэта, выдатны гісторык-славіст, з кожнай камандзіроўкі прывозіў патрэбныя універсітэту кнігі.

Да 1926 г. Беларуская дзяржаўная і універсітэцкая бібліятэка належала БДУ, 14 мая яна была рэарганізавана ў Беларускую дзяржаўную бібліятэку, а 2 кастрычніка была вылучаная са складу БДУ ў самастойную адзінку, якой універсітэцкая бібліятэка перадала большую частку свайго фонду ў 270 тысяч асобнікаў.

*Прыглядзьцеся да супрацоўнікаў нашай бібліятэкі — і вы зразумееце, што гэта самыя адукаваныя і найбольш эрудзіраваныя сярод нас людзі. Пагутарце з імі, пагаманіце, і вы атрымаеце вялізнае задавальненне.*

**А. КРУГЛОЎ,**
**доктар філасофскіх навук,**
**прафесар кафедры**
**філасофіі культуры, ФФСН**

Бібліятэкі ВНУ, што былі створаны на базе БДУ, таксама пачалі сваё існаванне за кошт фондаў універсітэцкай. Нягледзячы на такую шчодрасць, фонд нашай бібліятэкі да 1941 г. дасягнуў 200 тысяч тамоў.

### РЫЗЫКУЮЧЫ ЖЫЦЦЁМ

Падчас акупацыі Мінска большасць кніг універсітэцкай бібліятэкі была знішчана, частка каштоўнай літаратуры трапіла ў Германію, рэшткі ж проста выкінулі з памяшкання бібліятэкі. Дзякуючы супрацоўнікам універсітэта А. Вязовіч, А. Зубковіч, З. Завістовіч, А. Цітку, А. Доўнар, прафесару М. Прыляжаеву тры тысячы кніг з фондаў бібліятэкі былі захаваныя ў доме № 9 па вуліцы Віцебскай.

### АДНАЎЛЕННЕ І БУЙНЫ РОСТ

На аднаўленне бібліятэкі пасля вайны рэктарат выдзяляў 70 % свайго бюджэту. Літаратуру закуплялі ў букіністычных крамах і ў прыватных асоб. Дапамагалі Дзяржфонд літаратуры РСФСР, Маскоўскі універсітэт і іншыя ВНУ Расіі. Калі БДУ вярнуўся ў Мінск, бібліятэка заняла вялікую залу на фізіка-матэматычным факультэце і два буйныя пакоі дома на Віцебскай вуліцы (тут размяшчаўся абанемент, чытальная зала на 100 месцаў, аддзел апрацоўкі кніг і замежны аддзел). У памяшканнях не было ацяплення і электрычнага асвятлення, святло трапляла сюды толькі праз верхнія праёмы вокнаў — ніжнія ў вайну былі зацэментаваныя.

Знакавым стаў год 1962-і: пад бібліятэку аддалі спецыяльнае памяшканне, адкрыліся 4 чытальныя залы, арганізаваны аддзел кнігазахавання на 500 тысяч асобнікаў.

У 1989 годзе ў бібліятэцы з'яўляюцца першыя камп'ютары, а ў 1996 г. бібліятэка атрымала доступ у Інтэрнэт.

Бібліятэка была і застаецца асаблівым клопатам кіраўніцтва БДУ.

Многія пастаянныя чытачы перадаюць у дар свае ўласныя калекцыі кніг. У бібліятэчным фондзе ашчадна зберагаюць для новых чытачоў кнігі, сабраныя прафесарамі У. Перцавым, І. Некрашэвічам, В. Дзяменцьевым і інш.

Аднак галоўным рэсурсам бібліятэкі застаюцца яе супрацоўнікі, якія штодзённа камплектуюць, абслугоўваюць, інфармуюць... Летапіс ФБ назаўсёды захаваў імёны А. Эвенчык, А. Доўнар, М. Падскрабаевай, Р. Любінай ды многіх іншых.

### РЭСУРСЫ

Бібліятэкі ва ўсім свеце сёння ўжо не здольныя забяспечыць толькі сваімі фондамі і інфармацыйнымі рэсурсамі запыты чытачоў, якія пастаянна растуць. Асабліва гэта адчуваецца, калі гаворка ідзе пра замежныя публікацыі. Таму на сайце ФБ змешчаны спасылкі на знешнія інфармацыйныя рэсурсы, у тым ліку на паўнатэкставыя навуковыя часопісы ў электронным выглядзе (віртуальна "пагартаць" вы можаце болей за 7 тысяч выданняў). 10 баз даных міжнароднай карпарацыі EBSCO змяшчаюць вялізную колькасць рэфератаў па розных галінах навукі, а таксама замежныя даведнікі, агляды і г.д.

Каб спрасціць доступ да ўласных рэсурсаў бібліятэкі, ствараецца Электронная бібліятэка. Яе асновай мусяць стаць навукова-метадычныя матэрыялы і навуковыя працы выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў універсітэта. Але як абараняць правы аўтараў, чые матэрыялы змешчаны ў ЭБ?

Існаванне ЭБ дазволіць БДУ раўнапраўна ўдзельнічаць у розных міжнародных ініцыятывах (SPARC, Open Archives Initiative і інш.) па зніжэнні выдаткаў на камплектаванне ўласных бібліятэчных фондаў. Інфармацыйнае забеспячэнне нашага навучальнага працэсу зможа ўзбагаціцца онлайнавымі электроннымі інфармацыйнымі рэсурсамі іншых удзельнікаў такіх праектаў. Праграмна-тэхнічныя рашэнні для стварэння і вядзення ЭБ універсітэт атрымаў падчас удзелу ў міжнародных праектах ELib і VirLib і нават ужо адаптаваў.

Інфармацыйныя запыты чытачоў бібліятэка плануе забяспечваць таксама пры дапамозе электроннай дастаўкі дакументаў: па вашым заказе электронная копія першакрыніцы з бібліятэк краін СНД і больш далёкага замежжа будзе дасланая вам па тэлекамунікацыйных каналах.

Якасная адукацыйная і навуковая інфармацыя ў Інтэрнэце прапануецца толькі за грошы, бібліятэка ж намагаецца адкрыць сваім карыстальнікам доступ да такіх рэсурсаў на ільготных умовах.

### ПАМЕР І ЗНАЧЭННЕ

На 1 студзеня 2006 г. фонд бібліятэкі склаў 2 035 489 асобнікаў. Навучальныя выданні набываюць так, каб забяспечыць кожнага студэнта мінімумам абавязковай навучальнай літаратуры з разлікам 1:5 — адзін падручнік на 5 студэнтаў.

ФБ БДУ — не толькі найбуйнейшая з бібліятэк ВНУ краіны. На працягу дзесяцігоддзяў яна з'яўляецца Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтрам 56 такіх бібліятэк, арганізоўвае павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк, каардынуе правядзенне сумесных мерапрыемстваў.

З 1999 г. працуе аддзел гуманітарна-асветніцкай работы, прызначэнне якога — папулярызацыя найбагацейшай культурнай спадчыны, якую захоўвае бібліятэка. Ажыццяўляецца гэта праз культурна-масавую работу, што вядзецца на аснове "Комплекснай праграмы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ФБ на 2005-2010 гг." Праграмай прадугледжаны выставы, гутаркі, дыспуты, лекцыі, прэзентацыі, а пра тое, як і што здзяйсняецца, могуць распавесці самі студэнты — да іх на факультэты досыць рэгулярна наведваюцца знакамітыя творчыя асобы, навукоўцы і даследчыкі. Штомесячна супрацоўнікі бібліятэкі ладзяць па 20—30 розных выстаў.

### БУДУЧЫНЯ

Плануецца мадэрнізацыя крыла галоўнага корпуса, дзе зараз размяшчаецца бібліятэка. Камп'ютарны парк бібліятэкі няспынна павялічваецца, як і аб'ём інфармацыйных рэсурсаў, да якіх студэнт можа атрымаць доступ.

Бібліятэчная праграма "MARK-SQL" аўтаматызавала каталагізацыю, пошук у электронным каталогу, у тым ліку на аснове Інтэрнэт-доступу. Сёння задача — аўтаматызаваць кнігавыдачу.

Так што сваё 85-годдзе бібліятэка будзе адзначаць прагрэсіўнай Інтэрнэт-адукаванай маладзіцай, здатнай забяспечыць інфармацыяй кожнага. Сябруйце з ёй — і яна дасць веды на ўсё жыццё.

**Падрыхтавала**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

*Заглыбішся з галавой у кнігу — і бібліятэка мяккім шэптам старонак будзе песціць твой слых. Усё ў жыцці мяняецца, змянілася і ты, бібліятэка: новая зручная мэбля, новыя кнігі і палічкі, камп'ютары, але тая цудоўная атмасфера застаецца заўсёды!*

**Антон ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**ад імя Савета старастаў, юрфак**

ВІНШУЕМ!

# ХІМІЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ – 75 ГАДОЎ

Хімічны факультэт БДУ — адзіны ў Беларусі факультэт, які вядзе падрыхтоўку спецыялістаў-хімікаў шырокага профілю. Яго выпускнікі працуюць у адукацыйных установах рознага профілю, у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на прамысловых прадпрыемствах хімічнага профілю. У іх ліку ёсць акадэмікі і члены-карэспандэнты НАН Беларусі, кіраўнікі навуковых і навучальных устаноў, прамысловых прадпрыемстваў.

Цяпер на 7 кафедрах факультэта працуюць 24 дактары і 64 кандыдаты навук. У навучальным працэсе ўдзельнічаюць таксама супрацоўнікі Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем.

Найлепшыя выпускнікі факультэта працягваюць адукацыю ў магістратуры і аспірантуры. За апошнія 10 гадоў на факультэце падрыхтаваны і абаронены 9 доктарскіх дысертацый і 61 кандыдацкая.

Супрацоўнікі хімфака штогод публікуюць каля 300 навуковых работаў. Факультэт прымае ўдзел у 30—40 рэспубліканскіх і міжнародных навукова-тэхнічных выставах. Супрацоўнікі, аспіранты, магістранты і студэнты факультэта рэгулярна ўдзельнічаюць у 50—60 навуковых канферэнцыях кожны год.

Студэнты з малодшых курсаў маюць магчымасць удзельнічаць у выкананні навуковых і прыкладных даследаванняў, якія ладзяцца на кафедрах факультэта і ў лабараторыях НДІ ФХП БДУ, нярэдка іх прываблiваюць да інавацыйнай дзейнасці. Калектыў выкладчыкаў факультэта з'яўляецца аўтарам новага пакалення школьных падручнікаў па хіміі.

Штогод супрацоўнікі факультэта рыхтуюць і выдаюць 5—10 найменняў навучальных дапаможнікаў, многія з якіх атрымліваюць грыф Міністэрства адукацыі.

Работай факультэта кіруе дэканат і Савет факультэта на чале з дэканам — прафесарам У.В. Паньковым.

На факультэце існуюць такія студэнцкія арганізацыі, як савет старастаў факультэта, прафсаюзная арганізацыя, камісія па кантролі за якасцю адукацыі, студэнцкія саветы інтэрнатаў, творчыя калектывы (МХАТ — "Мясцовы хіміка-аналітычны тэатр", вакальныя гурты), савет навукова-даследчай работы студэнтаў, рэдакцыя газеты "Vox populi".

Штогод у маі ладзіцца свята "Дзень хіміка", якое распачалі яшчэ ў 1972 г. тагачасныя студэнты.





## УСЁ ПРАВЯРАЕЦЦА ПРАКТЫКАЙ

Прызнаннем паспяховага развіцця навуковых даследаванняў на хімічным факультэце стала стварэнне (у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР № 371 ад 22 лістапада 1977 г.) Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем, які ўключыў у сябе ў той час усе навуковыя падраздзяленні факультэта.

Ініцыятарамі стварэння НДІ ФХП былі Ф.М. Капуцкі і В.В. Свірыдаў.

У 1993—1997 гг. інстытутам кіраваў прафесар, доктар хімічных навук С.К. Рахманаў. З 1997 г. яго ўзначальвае член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар хімічных навук А.А. Івашкевіч.

На перыяд 2006–2010 гг. інстытут прызначаны галаўной арганізацыяй-выканаўцам па падпраграме "Малатаннажная хімія" Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы "Хімічныя тэхналогіі і вытворчасці", падпраграме "Лекавыя сродкі" ДНТП "Новыя лекавыя сродкі", Дзяржаўнай комплекснай праграме навуковых даследаванняў "Хімічныя рэагенты і матэрыялы", Дзяржаўнай праграме арыентаваных фундаментальных даследаванняў "Фізіялагічна актыўныя рэчывы".

Інстытут наладзіў плённае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з шэрагам навуковых цэнтраў ЗША, Германіі, Італіі, Карэі, Кітая, Японіі, Бельгіі, Расіі ды іншых краінаў.

У падраздзяленнях інстытута падрыхтаваны і абаронены 21 доктарская і 160 кандыдацкіх дысертацыяў. Па выніках даследаванняў выдадзена 28 манаграфіяў і зборнікаў навуковых работ, супрацоўнікі інстытута апублікавалі каля 4000 навуковых артыкулаў і больш за 3000 тэзісаў дакладаў.

**Падрыхтаваў Віктар АНДРЭЯЎ**

ВЫДАТНЫЯ ІМЁНЫ БДУ

## ДА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПРАФЕСАРА ПІКУЛЕВА

***10 кастрычніка спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння доктара біялагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры біяхіміі, колішняга дэкана біялагічнага факультэта Анатоля Цімафеевіча Пікулева (1931—1993).***



Анатоль Цімафеевіч скончыў у 1955 г. Валгаградскі медыцынскі інстытут, а ў 1958 г. — аспірантуру пры ім. Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі А. Пікулеў працаваў у Кемераўскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце. А з 1961 г. яго навуковая і педагагічная дзейнасць звязаная з Белдзяржуніверсітэтам. Ён пачаў працу на кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслінаў. А з 1964 г., калі стварылася кафедра біяхіміі, Анатоль Цімафеевіч узначаліў яе і кіраваў да 1993 г. У БДУ А. Пікулеў пачаў займацца вывучэннем уплыву адносна малых дозаў іянізуючай радыяцыі на працэсы азоцістага метабалізму ў жывёльных арганізмах. Вынікі шматгадовых даследаванняў ён абагульніў у трох манаграфіях і шматлікіх артыкулах. Асаблівую важнасць яны набылі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Навуковец стварыў навукова-даследчую лабараторыю біяхіміі абмену рэчываў пры кафедры біяхіміі. А.Пікулеў падрыхтаваў 32 кандыдаты і 1 доктара навук. Яго пяру належаць больш за 300 навуковых работаў. Ён быў членам Еўрапейскага таварыства нейрахімікаў, ганаровым членам Югаслаўскага таварыства імя Пуркіньэ, старшынёй мінскага гарадскога біяхімічнага таварыства, уваходзіў у навукова-метадычныя саветы розных узроўняў (у тым ліку АН СССР і АН БССР).

Вялікі ўнёсак зрабіў А. Пікулеў у развіццё біялагічнага факультэта, калі працаваў дэканам (1973—1980 гг.). У памяць пра навукоўца 420-я лекцыйная аўдыторыя кафедры біяхіміі была названая ў гонар прафесара А. Пікулева. У ёй размяшчаюцца бібліятэка даследчыка, перададзеная яго жонкай у дарунак кафедры.

**Калектыў кафедры біяхіміі**

# БДУ ў СМІ Беларусі




У другой палове верасня журналістаў зацікавілі наступныя тэмы і падзеі:

Вучоба на геафаку і славутыя знаходкі студэнтаў-геолагаў — "Я веду тебя, Земля!" (**"Рэспубліка", 27.09**).

Пераможца конкурсу "Куратар года БДУ" — "Куратор года — это звучит гордо" (**"Рэспубліка", 26.09**).

Меркаванні дэканаў БДУ наконт профільнага экзамену падчас уступнай кампаніі — "Класічны экзамен: у першым патоку — добрае пачынанне. А ў другім?" (**"Настаўніцкая газета", 26.09**).

Павышэнне платы за навучанне ў БДУ — "Белорусские новости" (21.09); "**Комсомольская правда в Беларуси**" (22.09); "Копилка для знаний" (**"Советская Белоруссия", 22.09**); "Научат за доплату" (**"Белгазета", 27.09**); "Хочаш скідак — вучыся на "выдатна" (**"Звязда", 30.09**); "Стоимость обучения в БГУ составляет 1,7 до 2,5 тысяч долларов в год" (**www.news.by**); "Образование стало дороже" (**"Вечерний Минск", 02.10.**).

Адкрыццё кацельні ў аздараўленчым комплексе БДУ "Брыганціна" — "Брыганціна" пойдзе ў свабоднае плаванне" (**"Настаўніцкая газета", 23.09**); "Бригантина" открывает корпуса" (**"Минская правда", 26.09**); "Бригантина" — в круглогодичном плавании" (**"Рэспубліка", 27.09**).

Студэнцкія прафсаюзы — тэма артыкула "Прафсаюз — гарой за студэнтаў" (**"Звязда", 22.09**).

Пашыранае пасяджэнне Вучонага савета БДУ — "Юбилей в "домашней" обстановке" (**"Рэспубліка", 22.09**).

Адкрыццё цэнтра навуковых даследаванняў БДУ і Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі — "Совместный проект" (**"Знамя юности", 22.09**).

Перамога выпускніка ліцэя БДУ ў складанай расійскай тэлевіктарыне — "Как стать "умником" и студентом МГИМО" (**"Народная газета", 21.09**).

Біятэхналогіі ў БДУ— тэма артыкула "Запусціць" спыненае сэрца і пазбавіцца ад апёкаў дапамогуць біятэхналогіі" (**"Настаўніцкая газета", 19.09**).

Стварэнне сістэмы электронных пасведчанняў для выкладчыкаў БДУ — "Пластиковые удостоверения для преподавателей БГУ" (**"Рэспубліка", 20.09; "БДГ-online", 14.09**); "Усіх выкладчыкаў — пад электронны ўлік" (**"Звязда", 15.09**); "Если студенческие электронные билеты появились в Белгосуниверситете в 2003 году, то электронные удостоверения для преподавателей..." (**"Ва-банк", 21.09**).

Аб святкаванні 30-годдзя факультэта радыёфізікі і электронікі — "**Народная газета**" (**16.09**).

Засяленне ў інтэрнаты — тэма артыкулаў "Хочаш жыць — плаці грошы" (**"Звязда", 15.09**); "Вольному — воля, а с "общагой" — рай" (**"Народная газета", 29.09**).

Адкрыццё новага спартыўнага комплекса "Універсітэцкі" — "Студенты БГУ станут спортивнее", "На зависть национальным сборным" (**"Рэспубліка", 14.09 і 16.09**); "БГУ — вуз спортивный" (**"Народная газета", 23.09**).

Будаўніцтва новага корпуса факультэта журналістыкі БДУ — "Скоро новоселье!" (**"Минский курьер", 16.09**).

Перамога на II Сусветным конкурсе праграмных праектаў кампаніі "Google" студэнтаў ФПМІ Дзмітрыя Мазовіка і Аляксандра Казачонка — "Лучшие среди студентов мира" (**"Рэспубліка", 14.09**); "Конкуренты докторам наук" (**"Знамя юности", 15.09**); "Беларускія прагамісты прадэманстравалі вышэйшы пілатаж" (**"Звязда", 14.09**); "Студенты факультета прикладной математики и информатики БГУ Дмитрий Мазовик и Александр Казачонок стали победителями..." (**"Работа сегодня", 18.09**).

Узнаўленне працы студэнцкага цэнтра занятасці БДУ — "За вакансиями — на ярмарку" (**"Минский курьер", 14.09**).

Пераможцы трэцяга працоўнага семестра ў БДУ — "Наши руки не для скуки" (**"Минский курьер", 14.09, 19.09**); "Ушанаванне лепшых студэнтаў БДУ..." (**"Настаўніцкая газета", 21.09**); "Разам — мы сіла!" (**"Звязда", 22.09**); "Самые умные и трудолюбивые" (**"Рэспубліка", 26.09**).

Міжнародная навуковая канферэнцыя "Аналітычныя метады аналіза і дыферэнцыяльных раўнанняў" (**"Рэспубліка", 13.09**).

Фальклорна-этнаграфічны музей на філфаку БДУ — тэма матэрыялу "Крэатыўны фальклор" (**часопіс "Беларусь", жнівень**).

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

**Па матэрыялах прэс-службы БДУ падрыхтавала Дар'я РАСОЛЬКА**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ЯПОНСКАЯ МОВА ЯК РОДНАЯ

***Студэнтка IV курса факультэта міжнародных адносін БДУ Юлія Абрагімовіч перамагла ў конкурсе на лепшае веданне японскай мовы. Цяпер яна прадстаўніц Беларусь на міжнародным конкурсе, што адбудзецца 28 кастрычніка ў Маскве.***

Другое і трэцяе месца занялі студэнты таго ж самага факультэта Сяргей Пяцека і Таццяна Пшанічная. У конкурсе ўдзельнічалі 10 чалавек, 8 з іх прадстаўлялі Белдзяржуніверсітэт і 2 — японскі культурна-адукацыйны цэнтар "Хігасі". Юнакі і дзяўчаты прадэманстравалі свае ўменне размаўляць па-японску на вольную тэму. Іх веды ацэньвалі Часовы Паверны ў справах Японіі ў Рэспубліцы Беларусь спадар Коікэ Такаюкі ды іншыя прадстаўнікі дыпламатычнай місіі гэтай краіны ў Беларусі.

Нагадаем, што ў Мінску такі конкурс адбываецца ў пяты раз пад патранажам пасольства Японіі і Беларускай асацыяцыі выкладчыкаў японскай мовы. Яго мэта — павысіць цікаўнасць да вывучэння японскай мовы, распаўсюдзіць інфармацыю пра культуру і мову Японіі, умацаваць сувязі паміж нашымі краінамі. Дарэчы, і ў мінулым годзе абсалютнымі пераможцамі конкурсу сталі таксама студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ.

**Падрыхтавала**
**Аліна КРУШЫНСКАЯ**

## ВІНШУЕМ!

# НАЙЛЕПШЫ КУРАТАР



Падведзены вынікі конкурсу "Куратар года БДУ", які штогод ладзіць упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю. Сёлета за званне лепшага з лепшых змагаліся 10 куратараў. Перамог выкладчык філалагічнага факультэта, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы Уладзімір Кулікові́ч. "Бронза" адышла Георгію Куневічу — старшаму выкладчыку кафедры канстытуцыйнага права юрфака. А месца паміж імі заняў Аляксандр Градзюшка з факультэта журналістыкі, намеснік дэкана, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі.

З першых словаў нашай размовы з куратарам другой групы другога курса аддзялення беларускай філалогіі Уладзімірам Кулі́ковічам я зразумела, чаму менавіта ён прызнаны найлепшым куратарам — жвавы, бадзёры, жыццярадасны і... апантаны сваёй справай.

— Група — гэта мае родныя дзеці, — кажа Уладзімір Іванавіч. — Дарагі падарунак, які я вельмі люблю і шаную! Нас аб'ядноўваюць агульныя справы, а іх на факультэце хапае. Мы ў конкурсах часта ўдзельнічаем, дзяўчаты ў мяне такія актывісткі: хто спортам займаецца, хто спявае! Часта ездзім разам па Беларусі: наведалі Смаргонь, Крэва, Гальшаны, Залессе, Нясвіж, Мір, Навагрудак. У паходы ходзім.

Захапленняў у самога куратара — колькі хочаш:

— Цяжка нават пералічыць! Увогуле я майстар спорту па радыёспорце (спаборніцтвы па тым, хто за пэўны час прыме і перадасць максімальную колькасць сігналаў азбукі Морзе), але аматар многіх відаў спорту: мячык пакідаць — не праблема, у тэніс згуляць ці ўзімку на лыжах — лёгка, хіба што вышываць не ўмею, а раней і бліны не мог пячы, пакуль дзяўчаты мае мяне не навучылі. А я, у сваю чаргу, навучыў іх у паходзе палатку ставіць, кашу варыць.

У групе Уладзіміра Іванавіча ажно 27 дзяўчат, і "усе яны такія розныя" — прызнаецца куратар. Самым цяжкім для яго было напачатку аб'яднаць іх, але для такога масавіка-зацейніка, як ён, які яшчэ і на баяне грае, няма нічога немагчымага.

Віншуем Уладзіміра Кулі́ковіча з перамогай і радуемся за групу, якой так пашанцавала з кіраўніком! Паболей бы ў БДУ такіх куратараў!

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# КАРЭЯ ЗАЦІКАВІЛАСЯ НАШЫМІ РАСПРАЦОЎКАМІ



Кіраўнікі найбуйнейшых навукова-даследчых інстытутаў у сферах прамысловасці, хімічных і электратэхналогій, харчовай прамысловасці, абсталяванняў і матэрыялаў, аэракасмічных даследаванняў, акіянаграфіі і тэлекамунікацыі Рэспублікі Карэя наведалі БДУ. Узначальваў делегацыю старшыня Карэйскага даследчага савета па навуцы і тэхналогіях у галіне прамысловасці Лі Хо Іль. Адбылася сустрэча з кіраўніцтвам Белдзяржуніверсітэта, у тым ліку з рэктарам, прафесарам Васілём Стражавым і першым прарэктарам, прафесарам Сяргеем Рахманавым, і кіраўніцтвам навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ. Госці з Паўднёвай Карэі азнаёміліся з распрацоўкамі навукоўцаў БДУ, пабывалі на фізічным факультэце, дзе наведалі вучэбныя лабараторыі, і на геаграфічным факультэце, дзе пазнаёміліся з музеем землязнаўства.

**Наталля ГАЛКІНА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

# БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ У ІРАНЕ

Больш за 50 распрацовак БДУ былі прадэманстраваныя ў межах нацыянальнай экспазіцыі тавараў беларускай вытворчасці на VI Тэгеранскім міжнародным прамысловым кірмашы, што адбыўся ў сталіцы Ірана ў другой палове верасня.

Навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была прадстаўлена ў некалькіх напрамках: прыборабудаванне, новыя матэрыялы, харчовыя і тэхналагічныя дабаўкі, а таксама новыя тэхналогіі, што прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы (ЗВЧ-тэхналогіі, перадпасяўная апрацоўка насення з дапамогай прэпарата "ГІСІНАР", ветэрынарныя прэпараты для лячэння мікраэлемектозаў жывёл і г.д.). Найбольшым попытам карысталіся распрацоўкі ў галіне сельскай гаспадаркі, ачысткі вады, кампазіцыйных і іншых палімерных матэрыялаў.

# СУМЕСНЫ ПРАЕКТ З ГЕРМАНІЯЙ

Новы сумесны беларуска-нямецкі праект па праграме павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў у галіне міжнароднага бізнесу распачнецца ў Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ. Ён накіраваны на выпускнікоў праграмы MBA ці іншых падобных праграм павышэння кваліфікацыі, кіраўнікоў і маладых упраўленцаў прадпрыемстваў нашай краіны, зацікаўленых у супрацоўніцтве з нямецкімі партнёрамі. Рэалізацыя новага праекта павінна адбыцца ў два этапы: пяцідзённы ўводны курс у Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ па арганізацыі і вядзенні сумеснага бізнесу, а потым — стажыроўка ў Берліне з 13 лістапада па 9 снежня 2006 г., падчас якой удзельнікі праекта наведаюць прадпрыемствы і фірмы, пабываюць у працоўных саюзах, парламенце і гандлёвых аб'яднаннях Германіі, сустрэнуцца з нямецкімі прадпрымальнікамі.

**Падрыхтавала**
**Аліна КРУШЫНСКАЯ**

## КАНФЕРЭНЦЫІ

Пятая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя **"Малекулярна-біялагічныя і фізіка-хімічныя метады ідэнтыфікацыі біялагічных аб'ектаў і матэрыялаў рознага паходжання"** прайшла на біялагічным факультэце БДУ. Сярод пытанняў форуму разглядаліся: роля Дзяржстандарту РБ у абароне спажыўцоў ад фальсіфіцыраваных і няякасных тавараў біялагічнага паходжання, метадычныя падыходы ў вызначэнні сапраўднасці лекаў, лекавых субстанцый і біялагічна актыўных рэчываў і інш.

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя **"Біялагічна актыўныя рэчывы раслін у медыцыне, сельскай гаспадарцы і іншых галінах"** (Нарачанскія чытанні — 2) адбылася на базе навучальна-навуковага цэнтра БДУ "Нарачанская біялагічная станцыя" з ініцыятывы геаграфічнага факультэта БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**падрыхтавала Аліна КРУШЫНСКАЯ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# МАГІСТРАНТЫ АТРЫМАЛІ ДЫПЛОМЫ

***Урачыстае ўручэнне дыпломаў магістрантам-завочнікам эканамічнага факультэта БДУ адбылося 29 верасня.***



Дыпломы атрымалі каля 80 чалавек. Магістранты эканамічных спецыяльнасцяў навучаюцца па двух асноўных напрамках — банкаўская справа і міжнародны менеджмент. Будучым эканамістам і банкаўскім работнікам даюцца веды, неабходныя ў рэальным сектары сучаснага банкаўскага кіравання, міжнародным і электронным гандлі, міжнародных банкаўскіх разліках і Інтэрнэт-маркетынгу. У магістратуры БДУ па эканамічных спецыяльнасцях навучаецца разам каля 300 чалавек.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## АБ'ЯВЫ

### УСТАНОВА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасадаў:**

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі нанахіміі;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак;

малодшага навуковага супрацоўніка сектара вогнетушыльных матэрыялаў.

**Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Дакументы прымаюцца па адрасе: 220030, г.Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

старшага выкладчыка кафедры мастацтваў;

выкладчыка кафедры мастацтваў.

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ дызайну;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, вышэйшай алгебры, дыферэнцыяльных ураўненняў, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, гісторыі новага і найноўшага часу, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі Расіі, крыніцазнаўства, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай алгебры, сучаснай беларускай мовы, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, сучасных замежных моў, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, экалагічнага і аграрнага права, дызайну;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, раманскіх моў, сучасных замежных моў, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння ЭВМ, матэматычнага мадэлівання і аналізу даных, эканамічнай геаграфіі замежных краін, дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі функцый.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:**

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці і патрыятычнае выхаванне (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — **13.11—25.11;**
2. Правы чалавека і дзяржаўная ідэалогія Беларусі: пытанні тэорыі і методыкі выкладання (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — **13.11—25.11;**
3. Школа лідэраў: асноўныя напрамкі і інтэрактыўныя тэхналогіі работы з моладдзю (для кіраўнікоў грамадскіх арганізацый устаноў адукацыі, сакратароў пярвічных арганізацый БРСМ) — **13.11—24.11;**
4. Работа педагога з адоранай асобай (для выкладчыкаў) — **13.11—25.11;**
5. Навучальны і выхаваўчы працэс ва ўмовах мадэрнізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі (для выкладчыкаў і спецыялістаў ВНУ) — **04.12—16.12;**
6. Гісторыка-культурная спадчына беларускага народа ў сістэме выхаваўчай работы са студэнцкай моладдзю (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) — **04.12—16.12;**
7. Сацыяльна-педагагічнае суправаджэнне сямейна-шлюбных адносін у студэнцкім асяродку (для выкладчыкаў ВНУ) — **11.12—22.12.**

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл/факс 200-25-51.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Н.А. Аленский.* **Сборник задач по программированию на языке С++.** У выданні прыводзіцца аўтарская рабочая праграма першай часткі асноўнага курса “Метады праграміравання”, які чытаецца на першым курсе механіка-матэматычнага факультэта.

*Л.А. Мечковский, Л.М. Володкович.* **Физическая химия.** Разгорнутая праграма курса фізічнай хіміі складзена паводле модульнай тэхналогіі. У ёй даюцца праграма курса, пытанні для самакантролю і літаратура да кожнага модуля, а таксама тэматыка практычных заняткаў, спіс лабараторных работ.

**Физическая культура.** У навучальным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі раз-



глядаюцца асновы агульнатэарэтычных і метадычных ведаў па фізічным выхаванні студэнтаў у ВНУ.

**Рафаил Габасов: К 70-летию со дня рождения.** Выданне прысвячаецца юбілею заслужанага дзеяча навукі Беларусі прафесара Рафаіла Габасава, падаецца храналагічны пералік яго прац.

*А.М. Янченко, М.И. Тарасик.* **Современные силовые полупроводниковые приборы.** У вучэбным дапаможніку выкладаюцца асноўныя ўяўленні пра фізічныя прынцыпы работы сучасных сілавых паўправадніковых прылад.

*С.И. Лебединский.* **Теория обучения русскому языку как иностранному: психолого-лингвистические и лингвометодические аспекты.** У вучэбным дапаможніку аналізуюцца псіхалагічныя, лінгвістычныя і лінгвадыдактычныя праблемы сучаснай тэорыі навучання рускай мове як замежнай.

*А.А. Врычыкава, А.А. Гусак.* **Асновы вышэйшай матэматыкі. У дзвюх частках. Ч. 2.** Другая частка вучэбнага дапаможніка з грыфам Міністэрства адукацыі мае тры раздзелы: матэматычны аналіз функцый некалькіх зменных, шэрагі і дыферэнцыяльныя раўнанні, тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка.

*О.В. Блажевич.* **Культивирование клеток.** У курсе лекцый прыводзяцца асноўныя метады культывавання клетак мікраарганізмаў, раслін і жывёл, спосабы падрыхтоўкі да эксперыменту.

*С.П. Бондаренко, А.Н. Исаченко.* **Модели данных и СУБД.** Практыкум змяшчае пяць лабараторных работ па мове SQL і яе працэдурным пашырэнні — мове PL/SQL шматкарыстальніцкай СУБД ORACLE.

**Средства массовой информации Америки = American Mass Media.** У дапаможніку змешчаны матэрыял па новай навучальнай дысцыпліне ў класічным універсітэце “Мова сродкаў масавай інфармацыі”, якая ўзнікла на стыку сучаснай лінгваметодыкі і культуралогіі.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ЛЕТА—2006

# АДПРАЦАВАЛІ НА «ВЫДАТНА»!

***Са сканчэннем жніўня для кагосьці са студэнтаў завяршыўся салодкі адпачынак, а для кагосьці — апошні працоўны семестр “Лета-2006”. Яго вынікі падвялі на святочнай цырымоніі ўшанавання і ўзнагароджання лепшых актывістаў студатрадаў БДУ, што адбылася 19 верасня ў кінатэатры “Цэнтральны”.***

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі студэнцкі гарадок БДУ і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю. Удзел у імпрэзе ўзялі рэктар Белдзяржуніверсітэта, прафесар Васіль Стражаў ды іншыя кіраўнікі БДУ, а таксама госці, сярод якіх нямала ветэранаў будатрадаўскага руху, што працавалі на галоўных будоўлях Савецкага Саюза.

Універсітэт, як вядома, мае сталую традыцыю правядзення працоўных семестраў, і з кожным годам яна набірае ўсё большую моц. Так падчас “Лета—2006” больш за восемсот студэнтаў БДУ працавалі ў будаўнічых, валанцёрскіх, педагагічных і сельскагаспадарчых студатрадах на самых розных аб’ектах Мінска і Мінскага раёна. Нашыя хлопцы і дзяўчаты вылучыліся на будаўніцтве гасцініцы “Еўропа” і цяплічнага комплексу ў вёсцы Багатырова, на сельскагаспадарчых работах у РУП “Шчамысліца” і на шматлікіх аб’ектах БДУ.

Васіль Стражаў асабіста падзякаваў студэнтам за выкананую працу, распавёў пра ўласны досвед, атрыманы ў студатрадах Белдзяржуніверсітэта, і выказаў спадзяванні, што з кожным годам рух гэты будзе пашырацца. На думку рэктара, няма нічога больш прыемнага для юнацтва, чым “пачуццё локця”, якое ўзнікае падчас цяжкай працы поплеч з сябрамі. Як паказвае статыстыка, спадзяванні рэктара зусім не марныя: паводле словаў першага сакратара Мінскага гарадскога камітэта БРСМ С.В.Чыграя, гэтым летам універсітэт паказаў найлепшае працаўладкаванне сваіх студэнтаў.

Такім чынам, актывісты трэцяга працоўнага семестра “Лета—2006” былі ўзнагароджаныя ганаровымі



граматамі і падарункамі, а лепшыя з іх — студатрад інтэрната № 4 БДУ — атрымаў кубак пераможцы. Свята завяршылася выступамі зорак беларускай эстрады, студыі сучаснага эстраднага танца «Non stop» студэнцкага гарадка БДУ і праглядам мастацкай кінастужкі.

**Аліна КРУШЫНСКАЯ**

ПАДЗЕІ

# АДКРЫЛАСЯ ТРЭЦЯЯ МЕДЫЯТЭКА

Новая медыятэка БДУ адкрылася па вуліцы Рэвалюцыйнай, 11. Яна знаходзіцца на другім паверсе Юрыдычнага каледжа Белдзяржуніверсітэта ў пакоі 203. Ветлівыя супрацоўнікі падкажуць, як знайсці патрэбны клас, як запісацца ў зручны час і як працаваць з камп’ютарам. Гэта трэцяя медыятэка БДУ (№ 1 — у корпусе геаграфічнага факультэта па вул. Ленінградскай, 16 у пакоі 114, а № 2 — у корпусе факультэта радыёфізікі і электронікі па вул. Курчатава, 5 у пакоі 211). У ёй 32 камп’ютары і ўсё патрэбнае абсталяванне: навушнікі, мікрафоны, прынтар, сканер і г.д. Студэнты, магістранты, аспіранты і супрацоўнікі БДУ могуць атрымаць тут хуткі доступ ў Інтэрнэт і амаль да ўсіх стандартных праграм, кшталту Word, PhotoShop, Excel і іншыя. Камп’ютары стаяць у вялікім светлым памяшканні, таму працаваць тут не толькі зручна, але і прыемна.

**Дар’я РАСОЛЬКА, фота аўтара**



НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# ПЕРАМОГ ІНТЭРНАТ №1

У студэнцкім гарадку БДУ 30 верасня завяршылася першынство па міні-футболе сярод інтэрнатаў, прысвечанае 85-годдзю універсітэта. Ініцыятарам спаборніцтваў выступіў цэнтр педагагічных тэхналогій студэнцкага гарадка БДУ і дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па футболе БДУ Уладзімір Пігулеўскі.



21 верасня барацьбу распачалі восем студэнцкіх камандаў, якія атрымалі цудоўную магчымасць адчуць сябе прафесійнымі спартсменамі і выпрабаваць свае сілы. Матчы праходзілі на полі Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па футболе са штучным пакрыццём, якое адпавядае ўсім еўрапейскім стандартам.

Фінал першынства быў надзвычай захапляльным, усе жадаючыя атрымалі магчымасць стаць сведкамі выдатнай гульні. У фінале сустрэліся зборныя каманды інтэрнатаў №1 і №7, у склад якіх уваходзілі сапраўдныя аматары футболу. І калі перавага ў галявых момантах была на баку каманды інтэрната №1, то на трыбунах сярод балельшчыкаў відавочнай перавагі не было. Напружаная барацьба разгарнулася і за 3-е і 4-е месцы паміж камандамі інтэрнатаў №4 і №6, агульны час скончыуся з лікам 3:3, вынік матча вырашылі пенальці: з лікам 3:1 перамогу атрымала каманда інтэрната №4. Кубак пераможцаў першынства па міні-футболе, прысвечанага 85-годдзю БДУ, атрымала каманда інтэрната №1, 2-е месца заняла каманда інтэрната №7, 3-е — каманда інтэрната №4. Віншуем з перамогай!

**Інэса АБЛАКАЗАВА,**
**метадыст цэнтра педагагічных тэхналогій студгарадка БДУ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ТЫДЗЕНЬ МАЦІ Ў БДУ

***Дзень маці ў БДУ, як павялося, адзначаць шырока і святочна. Сёлета ўся праграма, прымеркаваная да гэтай падзеі, прысвячаецца яшчэ і 85-годдзю нашага універсітэта.***

Пачнуцца мерапрыемствы 9 кастрычніка штогадовай дабрачыннай акцыяй “Мы памятаем Вас” з наведваннем жанчын-ветэранаў БДУ. 11 кастрычніка ў актавай зале інтэрната № 2 (вул. Кастрычніцкая,2) для студэнтаў універсітэта калектыў гарадскога клуба аматарскіх тэатраў “Таленты і паклоннікі” прадставіць літаратурна-музычную гасцёўню пад дэвізам “Сваёю маці ганарыся!” На наступны дзень, 12 кастрычніка, адбудзецца традыцыйны святочны канцэрт, прысвечаны Дню маці (ліцэй БДУ, вул. Ульянаўская, 8) з удзелам знакамітых артыстаў беларускай эстрады і творчых калектываў універсітэта. Пачатак у 18:00.

Выставай кветак 13 кастрычніка працягнецца серыя святочных акцый. Яна пройдзе ў актавай зале інтэрната № 7 (вул. Кастрычніцкая, 10а). Тут можна будзе абмяняцца насеннем кветак, а таксама набыць насенне шматгадовых раслін, кустоў і дрэваў. А ў 17.00 пачнецца вечарына для шматдзетных сем’яў з віншаваннямі, уручэннем падарункаў і канцэртам.

Уласна ў Дзень маці, 14 кастрычніка, для студэнцкіх сем’яў будзе арганізаваная экскурсія ў Жыровіцкі манастыр.

Завершыцца тыдзень 16 кастрычніка традыцыйнай сустрэчай рэктара БДУ, прафесара Васіля Стражава з маці таленавітых студэнтаў . Яна пройдзе ў 13.00 у Габеленавай зале будынка рэктарата БДУ (вул. Бабруйская, 5а).

**Па інфармацыі прэс-службы БДУ падрыхтавала Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

КОНКУРСЫ

## ПРАЯВІ ІНІЦЫЯТЫВУ

Загадам рэктара БДУ абвешчаны пачатак конкурсу на прысуджэнне грантаў на “Лепшы маладзёжны праект” сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Для гэтых мэтаў з універсітэцкага бюджэту вылучана 5 мільёнаў рублёў.

Афармленыя праекты можна падаваць ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (галоўны корпус БДУ, прасп. Незалежнасці, 4, пакой 207) да 20 кастрычніка 2006 года. Вынікі конкурсу экспертная камісія пад кіраўніцтвам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава падвядзе да 30 кастрычніка. Імёны пераможцаў будуць апублікаваныя ў газеце “Універсітэт”.

## ВЫБІРАЕМ НАЙЛЕПШЫХ

***У Белдзяржуніверсітэце засноўваецца конкурс на званне “Студэнт года БДУ”. Яго мэта — падтрымка таленавітай моладзі, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі стдэнтаў у галіне навукі, мастацтва, спорту і грамадскай дзейнасці.***

Пераможцы спаборніцтваў будуць вызначацца ў чатырох намінацыях — “Лідэр”, “Спорт”, “Навука”, “Культура”. Удзельнічаць у конкурсе змогуць студэнты, якія мелі на працягу ўсяго перыяду навучання высокія дасягненні па такіх напрамках, як навукова-даследчая работа, грамадскае жыццё і дзейнасць органаў студэнцкага самакіравання, спартыўнае жыццё, культурнае жыццё і творчасць.

Конкурс будзе ладзіцца ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю штогод. Пераможцаў будзе вызначаць экспертная камісія, складзеная з работнікаў упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, упраўлення па справах культуры, аддзела навукова-даследчай работы студэнтаў, студэнцкага гарадка, кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Пераможцы атрымаюць дыпломы і каштоўныя падарункі. Плануецца, што ўзнагароджанне будзе адбывацца на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета ў гонар дня заснавання БДУ.

**Матэрыялы на конкурс прымаюцца да 16 кастрычніка ва ўпраўленні выхаваўчай работы з моладдзю (галоўны корпус, каб. 207, тэл. 209-50-59).**

## З УСМЕШКАЙ

***

Прафесар чытае лекцыю ўжо некалькі гадзінаў:

— Прабачце, што я расказваю так падрабязна, у мяне няма гадзінніка.

Голас з аўдыторыі:

— За вамі вісіць каляндар.

***

Дэкан вяртае студэнту “залікоўку” і гаворыць:

— Твой бацька пасівее, калі ўбачыць тваю “залікоўку”.

— Не пасівее.

— Няўжо твае адзнакі яго не хвалююць?

— Хвалююць, але ён лысы.

***

— Што такое экзамен?

— Гэта гульня, у якой адзін ведае, але маўчыць, а другі не ведае, але гаворыць.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

9 кастрычніка 2006 года
Падпісана да друку 6.10.2006 г.
Зак. 888. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк 2.
Надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ”
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп’ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by